

ВАЙНА І МІР УНУТРЫ СЯМ'І

Сямейная газета

ЗА ДЗВЮМА ГІЕНАМІ 15



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 12 (30146)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мы павінны актыўна працаваць з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, асабліва мы павінны дапамагчы бацькам адаптаваць іх, і самае галоўнае — каб дзеці атрымалі адукацыю. У нас 99,9 працэнта дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця атрымліваюць адукацыю, з іх больш як 70 працэнтаў — інклюзіўная адукацыя. Мы маем 28-гадовы досвед менавіта ў атрыманні інклюзіўнай адукацыі. Гэта калі дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця разам з іншымі дзецьмі знаходзяцца ў дзіцячым садку, у школе. Здаровыя дзеці па-асабліваму ставяцца да іх і дапамагаюць ім асвоіць тыя ці іншыя навыкі, гэта развівае пачуццё сяброўства, талерантнасці і іншыя добрыя якасці, ідзе ўзаемаабмен, узаемаўзбагачэнне. Дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў гэтых умовах больш актыўна развіваюцца і атрымліваюць тыя навыкі і веды, якія ім неабходныя».*

# Сувязь пакаленняў




Ірына АШЫРАВА, начальнік сталічнага аддзялення паштовай сувязі № 115, — з дынастыі сувязістаў. Паштальёнам сорак гадоў у Чэрыкаве працавала яе бабуля, маці аддала галіне больш за трыццаць гадоў, большасць з якіх была тэлефаністкай. Бацька 35 гадоў працаваў у «Белтэлекаме», там жа працуе і брат Ірыны, і яго жонка — у паштовым аддзяленні ў Крычаве. Ірына пералічвае іншых сваякоў — усе яны так ці інакш звязаны з сувяззю. Сапраўдная сувязь пакаленняў — і вобразна, і літаральна.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі на 2024 год назначаны 62 аспірантам.**
- Больш як Br100 тыс. у ходзе акцыі «Нашы дзеці» сабрана на лекі для дзяцей з нейрабластомай.
- **Прадпрыемствы Краснадарскага краю ў восем разоў павялічылі суму здзелак на БУТБ.**
- Сабаленка прабілася ў 3-і раўнд адкрытага чэмпіянату Аўстраліі.
- **Прэзентацыі абласцей Беларусі на ВДНГ у Маскве завершацца выставай да 80-годдзя вызвалення.**

ISSN 1990 — 763X

Сацыяльны клопат

## ПРЫЧЫНІЦЦА ДА СВЯТА

### Мільён дзяцей і тысячы пажылых людзей паўдзельнічалі ў навагодніх дабрачынных акцыях



Фота БелТА.

**Мерапрыемствамі акцыі «Нашы дзеці» было ахоплена больш за мільён дзяцей па ўсёй Беларусі. На яе правядзенне рэгіёнамі было прыцягнута каля 6,5 мільёна рублёў. Прадстаўнікі больш як 150 рэспубліканскіх арганізацый, у тым ліку кіраўнікі дзяржорганаў, наведалі дзіцячыя дамы, школы, інтэрнаты. А цэнтральнай падзеяй акцыі стала дабрачыннае навагодняе свята 28 снежня ў Палацы Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы. Яркія ўражанні атрымалі ў навагоднія святы і пажылыя людзі падчас акцыі «Ад усёй душы». Пра вынікі гэтых мерапрыемстваў расказалі арганізатары.**

СТАР. 3

Па палічках

## А вы адказны падаткаплацельшчык?

### Якія даходы за мінулы год трэба задэклараваць і калі

**Інфармацыю аб сваіх гадавых даходах асобныя падаткаплацельшчыкі павінны накіраваць у інспекцыю не пазней за 31 сакавіка. Хто павінен прадставіць падатковую дэкларацыю за мінулы год і заплаціць падаходны падатак? Якія льготы прадугледжаны для розных катэгорый грамадзян? На гэтыя і іншыя пытанні мы паспрабуем сёння адказаць.**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СТАР. 13

Наталля КАЧАНАВА:

# «ДЛЯ НАС ВАЖНА АДЧУВАЦЬ, ЯК ЖЫВУЦЬ ЛЮДЗІ НА МЕСЦАХ»

## Спікер Савета Рэспублікі сустрэлася з дэпутатамі абласных і сельскіх Саветаў

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла сустрэчу са старшынямі абласных і сельскіх Саветаў дэпутатаў. Спікер верхняй палаты парламента запрасіла ўдзельнікаў да шчырай размовы аб праблемах на месцах і пытаннях, якія ўзнікаюць у розных рэгіёнах, і скіравала на эфектыўную работу.**



Фота БелТА.

### Людзі павінны жыць камфортна ў кожным населеным пункце

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу, што ў кожным населеным пункце людзі павінны мець магчымасць атрымаць усе даброты, жыць камфортна. І тут шмат залежыць ад мясцовых дэпутатаў.

— Мы гатовы абмяркоўваць усе вашы пытанні, прапановы, пажаданні. Нам неабходна іх пачуць, бо гэта важна ў рабоце над законапраектамі і ў прыняцці рашэнняў, — адзначыла яна ў пачатку сустрэчы. — Тая работа, якой вы займаецеся, мае вялікае значэнне для развіцця нашай краіны. Вы ведаеце, якая пільная ўвага ўдзяляецца развіццю рэгіёнаў у нашай краіне. Гэта вызначана VI Усебеларускім народным сходам, і гэта заўсёды праходзіць чырвонай лініяй у Прэзідэнта нашай краіны пры правядзенні нарад і тады, калі ён звяртаецца да народа і парламента. Ён заўсёды кажа, што людзі ў кожным рэгіёне нашай краіны, у кожным населеным пункце павінны мець магчымасць атрымліваць усе даброты і жыць камфортна, і сёння на гэта скіравана ўсё. На гэтым акцэнтуецца ўвага заўсёды: калі разглядаюцца пытанні аховы здароўя, адукацыі, цэнаўтварэння, функцыянавання нашых прадпрыемстваў, стварэння новых працоўных месцаў. Сёння гэтаму надаецца вялікае значэнне, так будзе і далей — у гэтым вы можаце не сумнявацца, — падкрэсліла спікер.

### Ва УНС павінны ўвайсці найлепшыя людзі краіны

Наталля Качанава праінфармавала, што работа па прывядзенні законаў у адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй цалкам закончана. Змены былі ўнесены ў 86 нарматыўных дакументаў, распрацавана два новыя законы, два страцілі сілу.

— На сёння гэты пытанні вырашаны на 100 працэнтаў. Усе змяненні і дапаўненні ў законапраекты ўнесены, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна нагадала, што, згодна з новай Канстытуцыяй, выбары ўсіх дэпутатаў будуць праводзіцца аднамоментна тэрмінам на пяць гадоў (замест чатырох) у адзіны дзень галасавання, які сёлета пройдзе 25 лютага.

— Канешне, у жыцці кожнай краіны гэта сур'ёзны палітычны момант. Дарэчы, сёлета 70 краін свету будуць праводзіць выбары. І гэта заўсёды той час, калі імкнуцца дэстабілізаваць абстаноўку, — дадала спікер Савета Рэспублікі.

Цяпер ідзе рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты. Толькі ад палітычных партый вылучана каля пяці тысяч кандыдатаў у дэпутаты розных узроўняў. Усяго трэба выбраць 12,6 тысячы дэпутатаў. У выбарчых камісіях будзе працаваць каля 70 тысяч чалавек. 4 красавіка будуць выбраны члены Савета Рэспублікі. Пасля фарміравання Саветаў дэпутатаў розных узроўняў, Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі да 25 красавіка будзе сфарміраваны Усебеларускі народны сход.

— У адпаведнасці з законам аб Усебеларускім народным сходзе, у адпаведнасці з нашай Канстытуцыяй, гэты орган будзе прымаць стратэгічна важныя рашэнні для жыцця нашай краіны. Таму туды павінны ўвайсці найлепшыя людзі нашай краіны, якія адданыя палітыцы, што праводзіцца, свайму народу, тыя, хто ў стане вырашаць вельмі важныя пытанні жыцця нашай краіны, — падкрэсліла Наталля Качанава.

### «Мы ведаем, што такое мір, і шануем яго»

Наталля Качанава адзначыла, што сітуацыя ў свеце складваецца няпростая, ідзе геапалітычны падзел свету. У такіх умовах Беларусь па-ранейшаму імкнецца праводзіць у жыццё міралюбную палітыку.

— Наша краіна — прававая дзяржава, а значыць, законы, якія прымаюцца, павінны быць актуальнымі, перспектыўнымі, своечасовымі. Жыццё мяняецца. Як правільна заўважыў кіраўнік нашай дзяржавы, той краіны, якая была да 2020 года, ужо не будзе. Але мы — мірная дзяржава. Прэзідэнт заўсёды прасоўваў ініцыятывы мірнай палітыкі. Мы нікому не пагражалі і не збіраемся, бо разумеем цану чалавечага жыцця. Сёлета мы будзем адзначаць 80-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы ведаем, што такое мір, вельмі шануем яго і перадаём гэту каштоўнасць з пакалення ў пакаленне. А свет, як сказаў Прэзідэнт, ідзе па тонкім лёдзе. Тое, што сёння пачалі бразгаць ядзернай зброяй — гэта вельмі страшна.

Беларусь гатова супрацоўнічаць з усімі краінамі, якія паважаюць нас і нашы традыцыі.

— У канцы 2023 года мы прынялі закон аб падпісанні дагавораў па ўступленні нашай краіны ў ШАС, — нагадала Наталля Качанава. — ШАС, БРІКС — тыя арганізацыі, якія сёння набываюць моц, і мы хочам стаць іх паўнапраўнымі ўдзельнікамі, бо гэта адкрывае для нас новыя магчымасці. А тая палітыка, якая праводзіцца Захадам у адносінах да нашай краіны, і гэта разумеюць народы Еўропы, часам брудная, несумленная, несправядлівая. Мы назіраем яе з боку палітыканаў, якія хочуць задушыць санкцыямі нашу краіну. Але не атрымліваецца і не атрымаецца. Бо тая задача, якая стаіць перад эканамічным блокам нашай краіны і ўрадам, вырашаецца, прычым няфрэнна.

### Кожны павінен працаваць адказна і сумленна

Спікер Савета Рэспублікі засяродзіла ўвагу, што бягучы год аб'яўлены Годам якасці. І гэта датычыцца абсалютна кожнага.

— Не ведаеце, з чаго пачынаць, як сказаў Аляксандр Рыгоравіч, — пачынайце з сябе і адказна займайцеся сваёй справай. Таму кожны на сваім працоўным месцы павінен працаваць — адказна, сумленна, прыстойна. Тым больш, што вы заўсёды на вастрыні — побач з тымі людзьмі, якія маюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. Падчас паездак па рэгіёнах я бачу, што ёсць пытанні, і яны ляжаць у плоскасці мясцовых і рэспубліканскіх органаў улады. Мы, дэпутаты, павінны першымі бачыць тыя пытанні, якія ёсць у нашай краіне, і вырашаць іх, — акцэнтавала ўвагу старшыня верхняй палаты парламента.

Наталля Качанава праінфармавала, што за мінулы год у Савет Рэспублікі паступіла 7,5 тысячы зваротаў. Акрамя таго, члены Савета Рэспублікі правялі 361 прамую лінію, 716 асабістых прыёмаў грамадзян, 2,1 тысячы сустрэч з працоўнымі калектывамі.

Напрыканцы размовы Наталля Качанава праанансавала, што такія сустрэчы будуць праводзіцца і далей.

**Алена КРАВЕЦ.**

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

# АБ'ЕКТЫЎНАСЦЬ У АСВЯТЛЕННІ І РОЎНЫЯ ПРАВЫ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

## Мініфарм абазначыў задачы СМІ ў выбудоўванні эфектыўнай камунікацыі падчас правядзення электаральных кампаній

**Беларускае грамадства напярэдадні найважнейшай палітычнай падзеі — адзінага дня галасавання. 25 лютага 2024 года ўпершыню ў гісторыі суверэннай дзяржавы мы будзем выбіраць дэпутатаў адразу ўсіх узроўняў — дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты завершана, у дадзены момант ажыццяўляецца іх рэгістрацыя. 31 студзеня стартуе перадвыбарная агітацыя, якая завяршыцца 24 лютага.**

На якіх умовах нацыянальныя медыя могуць прапаноўваць свае пляцоўкі кандыдатам у дэпутаты, на што звяртаць увагу журналістам падчас асвятлення адзінага дня галасавання і ў цэлым электаральнай кампаніі, кіраўніцтва Міністэрства інфармацыі абмеркавала з прадстаўнікамі цэнтральных і рэгіянальных СМІ на рэспубліканскім семінары «Роля СМІ ў выбудоўванні эфектыўнай камунікацыі падчас правядзення электаральных кампаній». Семінар прайшоў на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы відэа-канферэнц-сувязі да мерапрыемства далучыліся абласныя і раённыя рэдакцыі.

### Асаблівы ўпор — на інфармацыйную гігіену

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** заклікаў кіраўніцтва і прадстаўнікоў рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі звярнуць асаблівую ўвагу на гарантаванне бяспекі ў інтэрнэт-асяроддзі, забяспечыць аб'ектыўнае інфармацыйнае суправаджэнне электаральнага перыяду. «Галоўная задача сродкаў масавай інфармацыі ў перыяд электаральнай кампаніі — забеспячэнне адкрытасці і празрыстасці выбарчага працэсу, роўных правоў кандыдатаў у дэпутаты ўсіх узроўняў», — падкрэсліў ён.

Па словах міністра, у любой дзяржаве выбары — гэта асаблівы час, калі ва ўсяго грамадства абвастраецца цікавасць да палітыкі. «Наша з вамі задача — не дапусціць раз'ядняння грамадства і даносіць выверaную, праўдзівую інфармацыю аб падзеях у краіне і свеце, быць надзейнай абаронай ад фэйкаў, укідаў, маніпуляцый, — акцэнтаваў увагу кіраўнікоў і прадстаўнікоў СМІ Уладзімір Пярцоў. — Асаблівы ўпор павінен быць зроблены на інфармацыйную гігіену. Сродкі масавай інфармацыі павінны быць максімальна аб'ектыўнымі і дакладнымі ў пытаннях выкакання заканадаўства і забяспечваць роўныя ўмовы для ўсіх кандыдатаў у дэпутаты, якія будуць выступаць з пляцовак СМІ».

Міністр інфармацыі праанансаваў, што з 24 да 26 лютага на базе Палаца Рэспублікі будзе функцыянаваць Інфармацыйны цэнтр Цэнтральнай выбарчай камісіі. Там будуць працаваць не толькі журналісты, якія задзейнічаны ў асвятленні ходу выбарчай кампаніі, але і прадстаўнікі экспертнай супольнасці. Акрамя таго, на гэтай пляцоўцы плануецца ажыццяўляць прэс-канферэнцыі старшыні Цэнтрвыбаркама, місій міжнародных назіральнікаў, арганізаваць відэаканферэнцыі з прадстаўнікамі тэрытарыяльных выбарчых камісій.

### Усім — роўныя ўмовы

**Сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Алена БАЛДОЎСКАЯ** расказала ўдзельнікам семінара аб асаблівасцях гэтай электаральнай кампаніі, новаўвядзеннях выбарчага заканадаўства і прынцыпах электаральнага суверэнітэту. Падрабязна сакратар ЦВК спынілася на ўмовах правядзення агітацыйнай кампаніі кандыдатамі ў дэпутаты ў сродках масавай інфармацыі. «У ходзе агітацыйнага этапу СМІ павінны прытрымлівацца прынцыпу забеспячэння роўных умоў пры выдзяленні эфірнага часу і друкаваных плошчаў, дадатковыя агітацыйныя магчымасці прадстаўляюцца кандыдатам на платнай аснове выключна са сродкаў выбарчых фондаў», — канкрэтызавала яна.

У Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу вылучана 298 кандыдатаў у дэпутаты. Крыху больш за 30 % ад гэтай колькасці складаюць жанчыны. 12 чалавек — маладзейшыя за 31 год. Сярод кандыдатаў у ніжнюю палату парламента лідзіруюць прадстаўнікі навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту — 86 чалавек. 54 чалавекі прадстаўляюць сферы прамысловасці, транспарту і будаўніцтва, 52 грамадзяніны — работнікі дзяржорганаў. Сярод асоб, якія вылучаюцца, ёсць таксама работнікі сельскай гаспадаркі, прадпрымальнікі, ваеннаслужачыя, пенсіянеры.

У другой частцы семінара перад прадстаўнікамі рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ выступіў аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін, які расказаў аб знешнепалітычнай сітуацыі вакол Беларусі. Дырэктар Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Міністэрства эканомікі Наталля Берчанка вызначыла асноўныя прыярытэты ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, нагадала аб асноўных дасягненнях суверэннай Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эканоміка Германіі згарнулася па выніках мінулага года



Летась валавы ўнутраны прадукт у Германіі знізіўся на 0,3 працэнта ў параўнанні з мінулым годам. Гэта вынікае з афіцыйнага паведамлення Федэральнага статыстычнага агенцтва краіны. «Агульная эканамічная дынаміка ў Германіі пагоршылася ў 2023 годзе ва ўмовах, якія характарызуюцца шматлікімі крызісамі», — заявіла прэзідэнт статыстычнага агенцтва Рут Бранд. Нягледзячы на нядаўняе паслабленне інфляцыі, цэны заставаліся высокімі на ўсіх этапах эканамічнага працэсу і стрымлівалі рост эканомікі, адзначаецца ў паведамленні статыстычнага ведамства. Акрамя таго, складзіся неспрыяльныя ўмовы фінансавання праз павелічэнне працэнтных ставак і зніжэнне попыту ўнутры краіны і за мяжой.

### Навукоўцы адкрылі бялок, які можа змагацца са старэннем

Японскія навукоўцы выявілі бялок, які можа адкрыць новыя магчымасці для лячэння ўзроставых захворванняў, паведаміў Euronews. Бялок дапамагае чысціць пашкоджаныя арганелы — субадзінкі клеткі, якія выконваюць важную работу ўсярэдзіне яе і з'яўляюцца жыццёва важнымі для яе функцыянавання. Дзве з іх — мітахондрыі і лізасомы — дапамагаюць, адпаведна, выпрацоўваць энергію ў клетках і падтрымліваць іх здароўе. Пашкоджанне гэтых арганел звязана са старэннем і многімі захворваннямі. У новым даследаванні, апублікаваным у часопісе Proceedings of the National Academy of Sciences, навукоўцы з японскага Універсітэта Осакі і іншых медыцынскіх навучальных устаноў сцвярджаюць, што бялок пад назвай hexokinase domain containing 1 (HKDC1) дапамагае абараняць як мітахондрыі, так і лізасомы. «Мадуляцыя функцыі HKDC1 можа прадухіліць клеткавы сенісцэнс, які звязаны са старэннем і ўзроставымі захворваннямі», — сказаў Euronews старэйшы аўтар працы Шухей Накамура, прафесар біяхіміі Медыцынскага ўніверсітэта Нара.

# ПРЫЧЫНІЦЦА ДА СВЯТА

### Не толькі смачныя падарункі

Мерапрыемствамі акцыі «Нашы дзеці» было ахоплена больш за мільён дзяцей — святы праводзіліся ва ўсіх установах адукацыі краіны.

— Гэта было зроблена для таго, каб кожнае дзіця адчула свята, увагу і атрымала прыемныя эмоцыі. Усяго ж, паводле папярэдніх падлікаў, рэгіёнамі на правядзенне акцыі прыцягнута больш як 6,5 мільёна рублёў, — расказала **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.**

Штогод у акцыі «Нашы дзеці» ўдзельнічаюць вышэйшыя службовыя асобы краіны, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных арганізацый, банкаў, канцэрнаў, прадпрыемстваў. Сёлета прадстаўнікі больш як 150 рэспубліканскіх арганізацый наведалі розныя аб'екты — дзіцячыя дамы, школы, інтэрнаты, а таксама дамы-інтэрнаты для дзяцей з інваліднасцю, дзіцячыя бальніцы, рэабілітацыйныя цэнтры, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, сацыяльна-педагагічныя цэнтры, спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы.

Беларускі дзіцячы фонд далучыўся да правядзення святочных мерапрыемстваў па ўсёй краіне, і ў кожным рэгіёне пры іх падтрымцы былі арганізаваны мерапрыемствы. Акрамя таго, у акцыі «Нашы дзеці» актыўна ўдзельнічалі Беларускі саюз жанчын, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, а таксама прафсаюзы Беларусі.

Акцыя заклікана не толькі павіншаваць дзяцей, але і аказаць садзейнічанне ў вырашэнні якіх-небудзь важных пытанняў, прыцягнуць увагу грамадства да іх праблем. Таму ў якасці падарункаў хлопчыкі і дзяўчынкі атрымалі не толькі прысмакі, але і сродкі для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, а таксама для навучання, лячэння і развіцця.

### Новы фармат і галоўная ёлка

Гэтым разам урачыстае адкрыццё акцыі прайшло ў новым фармаце — у маёнтку беларускага Дзеда Мароза ў нацпарку «Белавежская пушча». На адкрыццё былі запрошаны 150 дзяцей. Кожная дэлегацыя паўдзельнічала ў квэсце і з дапамогай карты адшукала канверты з пасланнямі ад кожнай вобласці і Мінска. Таксама быў арганізаваны тэлемост з усімі абласнымі цэнтрамі Беларусі. Далей традыцыя такога адкрыцця будзе працягнута. Так, у наступным годзе эстафету ў Брэсцкай вобласці прыме Віцебская.

А вось цэнтральнай падзеяй акцыі стала дабрачыннае навагодняе свята 28 снежня ў Палацы Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы. Падчас яго маленькім гледачам паказалі навагодняе прадстаўленне «Машына навагодняга часу». На галоўную ёлку краіны былі запрошаны 2370 дзяцей ва ўзросце 8—14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Гэта дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў, пераможцы міжнародных конкурсаў, алімпіяд, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, а таксама навучэнцы, якія дасягнулі поспехаў у грамадскай рабоце.

Таксама на галоўную ёлку былі запрошаны дзеці з Латвіі, Літвы, Прыморскага краю Расіі, дзеці сем'яў-бежанцаў з Палесціны і іншыя. Для ўдзельнікаў свята акрамя галоўнай ёлкі было арганізавана наведванне навагодняга прадстаўлення ў Беларускім дзяржаўным цырку.

А 3-4 студзеня прайшлі святочныя мерапрыемствы ў Палацы Незалежнасці, удзельнікамі якіх былі і дзеці з сацыяльна неабароненых катэгорый — усяго больш за 750. Усе яны атрымалі навагоднія падарункі і шмат прыемных уражанняў. 27 снежня адбылася Усебеларуская піянерская ёлка. Акрамя таго, у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў студзені праведзены прадстаўленні для больш як 800 дзяцей педагагічных работнікаў.

У Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» на зімовых канікулах прайшла 9-дзённая тэматычная змена. Усяго за гэты перыяд у «Зубраніцы» аздаравіліся 167 дзяцей.

— Знакавымі сталі паездка з Мінска ў маёнтак Дзеда Мароза для выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама рэспубліканскае мерапрыемства ў гарналыжным цэнтры «Сілічы» для дзяцей-сірот і выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу Мінска, Мінскай вобласці, Магілёўскай і Віцебскай абласцей, — адзначыла Алена Вайцяховіч.

Дарэчы, добрай традыцыяй акцыі стала адкрыццё дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Напрыклад, 18 снежня ў Бешанковіцкім раёне адкрыўся другі дзіцячы дом сямейнага тыпу. Плануецца, што гэта сям'я прыме на выхаванне ад 5 да 10 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

### 100 тысяч рублёў для дзяцей з нейрабластомай

Беларускі дзіцячы фонд штогод арганізоўвае шэраг дабрачынных мерапрыемстваў для сацыяльна неабароненых катэгорый дзяцей. Падчас цяперашняй акцыі аказана дапамога і падтрымка, а таксама набыты матэрыяльныя каштоўнасці на суму больш як 298 тысяч рублёў. Пры гэтым падарункі атрымалі 10 703 дзіцяці.

У ходзе дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ўжо трэці раз адбыўся рэспубліканскі дабрачынны марафон, арганізаваны Мінадукацыі і Міністэрствам аховы здароўя пры падтрымцы Беларускага дзіцячага фонду. Фонд распрацаваў інфармацыйныя лістоўкі, якія размяшчаліся ў транспарце, на інфармацыйных рэкламных стэндах. Таксама зняты відэаролік, які трансліраваўся на тэлеканалах.

— Падчас акцыі ў бягучым годзе мэта збору грошай — набыццё лекавых прэпаратаў для дзяцей з захворваннем на нейрабластому, якія цяпер праходзяць лячэнне ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі, імуналогіі. У перыяд правядзення марафону сабрана 102 тысячы рублёў. Гэта сума значна перавышае леташнюю, — расказала Алена Вайцяховіч.

Адметна, што большую частку сабраных сродкаў пералічылі менавіта фізічныя асобы. Такім чынам, самі грамадзяне актыўна адгукнуліся і захацелі паўдзельнічаць у марафоне дабра.

— У мінулым годзе сродкі ў рамках дабрачыннага марафону збіраліся для дапамогі дзецям з аўтызмам. Падобную акцыю ўжо на працягу 12 гадоў праводзіць Магілёўскае абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду «Сагрэем дзіцячыя сэрцы», дзе ажыццяўляецца дабрачынны збор сродкаў. Сёлета яны таксама сабралі больш чым 100 тысяч рублёў і накіравалі іх на стварэнне навучальнага гульнявога асяроддзя ў Бялыніцкай спецыяльнай школе-інтэрнаце, Круглянскім цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, а таксама Асіповіцкай спецыяльнай школе-інтэрнаце. Сродкі накіраваны і на аказанне дапамогі пяці дзіцячым дамам сямейнага тыпу Магілёўскай вобласці і пяці сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў і маюць патрэбу ў набыцці сродкаў рэабілітацыі, — адзначыла Алена Вайцяховіч.

### Асобнае святочнае жыццё

Яркай стала і нядаўняя акцыя «Ад усёй душы».

— Гэта дастаткова малады праект, які рэалізоўваецца толькі другі год. Аднак водгук, які мы атрымалі з боку беларусаў, людзей, якія хочуць і гатовы прымаць удзел у акцыі, удзяляць увагу пажылым грамадзянам, вельмі маштабны, — расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА.** — Сёлета фармат мерапрыемстваў быў вельмі разнастайны. Па водгуках бабуль і дзядуляў, за гэтыя тры тыдні людзі пражылі асобнае яркае святочнае жыццё, чаму мы бясконца рады.

Сёлета Мінпрацы крыху па-іншаму падышло да правядзення акцыі, падзяліўшы яе на два ўмоўныя перыяды. Спачатку ішла падрыхтоўка да святочных навагодніх мерапрыемстваў, а потым урачыста іх адзначалі. У першы перыяд акцыі ў падрыхтоўчых мерапрыемствах паўдзельнічалі больш за 50 тысяч пажылых грамадзян. Ім дапамагалі навучэнцы, школьнікі, студэнты, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, работнікі ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання. Яны дапамагалі прыбіраць кватэры і дамы, наводзіць парадак на прыдамавых тэрыторыях, куплялі прадукты да святочнага стала і разам рыхтавалі навагоднія стравы.

Другі этап акцыі быў віншавальны. У гэтым годзе па ініцыятыве Мінпрацы вырашылі правесці асобныя профільныя дні, іх атрымалася чатыры. У гэты час па ўсёй краіне праводзіліся адзіныя мерапрыемствы. Трэцяга студзеня ва ўсіх абласцях прайшлі яркія і маштабныя віншавальныя мерапрыемствы, канцэрты і святочныя вечары. У прыватнасці, у Вялікім тэатры быў арганізаваны паказ для больш як тысячы пажылых мінчан. Без увагі не засталіся і грамадзяне, якія жывуць у рэгіёнах, раённых цэнтрах і сельскіх населеных пунктах, для якіх таксама былі арганізаваны віншавальныя мерапрыемствы.

Дзясятага студзеня па ўсёй Беларусі арганізавалі творчыя выставы пажылых грамадзян. Яны суправаджаліся рознымі выступленнямі, былі прэзентаваны таксама карціны і вырабы. Яркім атрымалася і 11 студзеня, калі пажылыя людзі разам з моладдзю танцавалі на балях. Усяго ўдзел прынялі больш за шэсць тысяч чалавек. А дванаццатага студзеня, напярэдадні старога Новага года і ў рамках развіцця праекта «Роўны роўнаму», валанцёры сярэбранага ўзросту хадзілі з віншаваннямі да пажылых грамадзян.

**Алена КРАВЕЦ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

По сутнасці

# ЦЯГНІК ІДЗЕ НЕ СПЫНЯЮЧЫСЯ



**Завеі. Сцюжа. Мароз. Студзень. Сапраўдны, як яму і належыць быць. За акном цягніка зімовы лес. А мчым наперад. У цёплым і ўтульным салоне. Кожны са сваімі думкамі, мэтамі і марамі. Разам і наперад. Цягнік лакаматыў, не звяртае ўвагу на сцюжу і завею... Ці не гэта вобраз нашай дзяржавы? Яна, нібыта цягнік, імчыцца наперад, не зважаючы на перашкоды, тыя геапалітычныя выпрабаванні, на пахаладанне ў міжнародным дыпламатычным клімаце. Цягнік імчыць, а мы ва ўтульным асяроддзі толькі за гэтым усім і назіраем праз «акно» — праз экран тэлевізара, гаджэта альбо праз манітор...**

Але ёсць людзі, якія намагаюцца наўмысна альбо па невераганасці разбіць тое шкло ў цягніку, націснуць на стоп-кран. Навошта? Навошта глабальную сцюжу мы будзем запрашаць да сябе ў хату? Каб стаць, як Украіна — у лахманах, з незайздросным выбарам: альбо жабраваць, альбо гінуць? Тых «рамантыкаў» майдана ўжо няма — загінулі ці пакалечаны, іншыя з'ехалі, а за іх «культурныя маршы» і нацысцкія амбіцыі плацяць звычайныя людзі...

А палітычныя завеі не сціхаюць. Замест Віфлеемскай зоркі ў Раство на Блізкім Усходзе рэха выбухаў. Амерыканскія сцярвятнікі бамбяць Емен, і, як ні прыслухоўвайся, не чутна асуджэння з боку міжнародных праваабаронцаў, маўчаць «самыя мірныя» прыхільнікі збеглай кааліцыі. А эксперты прагназуюць новую нагоду свету вар'яцець — яшчэ адну пандэмію. З пазнакай «ікс». Аб гэтай хваробе разважалі нават у Давосе — у месцы, дзе збіраецца сусветная эліта. І адтуль ужо пайшлі чуткі, якія вельмі палохаюць...

А ў Беларусі зноў электаральная кампанія. Прычым упершыню адзіны дзень галасавання. Адразу змены на ўсіх узроўнях заканадаўчай улады. Зноў прыйдзецца здаваць экзамен: камусьці — на сумленнасць, камусьці — на сталасць разумення працэсаў, а каму — на мужнасць і адданасць абранаму шляху. І ўсім нам — на павагу да сваёй краіны, дый проста на ўдзячнасць. Як кажуць, прапусціць дзень выбараў — тое самае, што не павіншаваць родную маці з днём нараджэння.

Гэты важны іспыт нам спрабуюць сарваць звонку. Трэба разумець: грошы заканчваюцца, цярпенне спонсараў — таксама. Вось яны і выдумляюць розныя спосабы хлусні і падману беларускага грамадства. Спрабуюць ізноў завесці ў багну. У калабарантаў існуе некалькі планаў. Самы страшэнны — гэта адкрытая агрэсія. Розныя «харугвы», якія гатовыя заліць Беларусь крывёю. Шлях ад «светлага твару пратэстаў» да нацыка — вельмі кароткі. Нават прапагандыстам не трэба нічога выдумляць — даволі паслухаць тое, што прапаноўваюць невераградныя штабы. Гвалт і бойку. Дарэчы, у розныя экстрэмісцкія і нават тэрарыстычныя аванцюры яны ўцягваюць і тых, хто тут, — прыхаваных ворагаў ды «рамантычных» натур. Але ж адказнасць вельмі суровая. Уласцівыя для нас гуманізм і літасць не час праяўляць. Інакш на заводах былі б выбухі, а цягнікі сыходзілі б з рэльсаў, а далей і краіну б абрынулі. Калі гэта хто яшчэ не зразумеў — шкада. Усе гэтыя баявыя суполкі створаны дзеля аднаго: яны павінны стварыць прэцэдэнт. Маўляў, іх ідэі забіваць і знішчаць сваіх жа суайчыннікаў падтрымліваюць усе беларусы... А далей — натаўскія танкі на нашай тэрыторыі, Беларусь — тэрыторыя проксі-вайны. Так званы рэванш за іміджавыя і фінансавыя страты ва Украіне. А ўсё пачыналася з мірных маршаў. І вось да чаго яны маглі неўзабаве прывесці... «Ахвяры»ператвараюцца ў катаў. Такое магчыма падчас безуладдзя і пры адсутнасці моцнай праваахоўнай вертыкалі.

Апошняе, канешне, не пра нас. Але нават самае дужае дрэва можа загінуць з-за ўнутранных хвароб — супярэчнасцяў. Менавіта на гэта і ставяць ворагі беларусаў, намагаючыся вывесці наша грамадства з раўнавагі. Сёння ў іх на парадку дня дыскрэдытацыя маючай адбыцца электаральнай кампаніі. Асабліва ў вачах моладзі. Моладзі патрэбны хайп. Каб зацікавіць. Але тое, што моладзі больш нічога не трэба, бо ўсё ёсць — ці не найлепшы доказ таго, што ў «дыктатуры» людзям нядрэнна жывецца? Таму і мітусяцца, і заклікаюць байкатаваць адзіны дзень галасавання. Хаця, калі падумаць, гэтыя заклікі — не што іншае, як пацвярджэнне таго, што ў грамадстве ёсць жаданне ісці на выбары. Калі б яго не было, то і не трэба было б заклікаць да ігнаравання.

Справа ў тым, што палітычныя лузеры не маюць падтрымкі сярод людзей, каб удзельнічаць у выбарах, прапаноўваць грамадству сваіх кандыдатаў. Так было заўжды: бачачы, што іх чакае фіяска, яны адразу пачыналі лямантаваць: «байкот і фальсіфікацыя». На іншае яны не здатныя.

На чым яны паспрабуюць хайпануць цяпер? На мясцовых праблемах. Яма на дарозе, абыякавы ўрач, дэфіцыт рабочых месцаў... Але ж больш выпадкаў, калі іх, рабочых месцаў, хапае. Як і класных магістраляў, і зычлівых урачоў... Але пра гэта мы саромеемся казаць, а калі і будуць пісаць дзяржаўныя СМІ, то некаторыя махнуць рукой: маўляў, прапаганда. Кажуць: трэба шукаць новыя і суперсучасныя метады інфармавання. Займацца піярам...

Але моц дзяржавы — у яе справах, а не ў піяры. А мы павінны разумець: тыя, хто цяпер намагаецца ўкрасці нашы сэрцы, выбіць шкло ў нашым цёплым цягніку дзеля папаўнення сваіх банкаўскіх рахункаў і перамог заходніх гегемонаў, нават ужо нічога не абяцаюць, а толькі плююць у калодзеж, з якога мы ўсе бяром ваду.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# «Паралельныя светы»: убачыць і асэнсаваць






**Фотавыстава БелТА «Паралельныя светы» адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Аснову фотапраекта склалі кадры з архіва агенцтва, якія адлюстроўваюць два светы: свет дзяржавы — стваральнай працы і развіцця, і свет апазіцыі — разбурэння і дэградацыі.**










«На выставе 17 плакатаў, 17 разважанняў пра два светы і нагоды задумацца. Падбіраючы фота для праекта, мы ў першую чаргу аналізавалі, што зроблена ў нашай краіне ўладай за апошнія тры дзесяцігоддзі і што стала за гэтыя гады з апазіцыяй. Па сутнасці, гэтыя кадры — нішто іншае як наша гісторыя, гісторыя Беларусі апошніх 30 гадоў, захаваных у моманце. Толькі з аднаго боку гэта шлях развіцця, стваральнай працы, захавання і прымнажэння. А з другога — разбурэння і дэградацыі», — адзначыла на адкрыцці выстаўкі **генеральны дырэктар БелТА Ірына АКУЛОВІЧ.**

Яна звярнула ўвагу на лозунгі, з якімі, як відаць на фота, выходзіла беларуская апазіцыя: «Дзяржава сацыяльнай не бывае», «Няма дзяржавы — няма праблем» — гэта іх лозунгі. Яны гатовы разбураць любыя асновы. На пачатку свайго шляху яны яшчэ рабілі выгляд, што выступаюць за сацыяльную справядлівасць, але хутка перайшлі да іншых наратываў. Продаж дзяржуласнасці, булінг усіх, хто не з імі, пагрозы нават дзецям! Размахванне зброяй на акцыях пратэстаў і нават падрыхтоўка тэрарыстаў, якім унушаюць, што трэба вярнуцца ў краіну, каб забіваць сваіх жа суседзяў... Усё гэта — не нашы выдумкі, не прыдумкі, гэта фіксацыя факта. Увесь шлях так званай беларускай апазіцыі — на фота, прадстаўленых тут».

Паводле слоў **члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук, доктара гістарычных навук, прафесара Ігара МАРЗАЛЮКА,** фотавыстава «Паралельныя светы» — яскравае сведчанне таго, што абсалютная большасць беларусаў настроена на стваральную працу, пазітыўныя змены ў сваёй краіне. «Мы можам убачыць чорнае і белае, вось гэтую дыхатамію, якая сведчыць аб тым, што не можа быць пазітыўнага парадку дня, калі вы ненавідзіце іншага, — адзначыў ён. — Наша найважнейшая задача — сшываць соцыум, умацоўваць яго, знаходзіць агульныя кропкі, а не разрываць, знішчаць».

**Народны пісьменнік Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** звярнуў увагу на сюжэт, прысвечаны Чарнобыльскай аварыі. Калі сотні тысяч беларусаў працавалі над аднаўленнем забруджаных земляў, адраджэннем паўнавартаснага жыцця ў родным краі, іншыя стваралі хайп дзеля ўласнай выгады і ўзбагачэння: «Варта толькі задумацца аб асацыяцыях, якія ўзнікаюць у нас пры згадванні «чарнобыльскага шляху» апазіцыі, і ў свядомасці ўзнікаюць гул пустых лозунгаў, атмасфера агрэсіі і падвойных стандартаў». Гэта адлюстроўвае і фотавыстава БелТА, дзе наглядна паказана, як пераадольваліся цяжкасці пры ліквідацыі наступстваў аварыі. «А таксама тое, як абясцэньваліся ідэі тых, хто яшчэ ў 80-х гадах спрабаваў прыцягнуць увагу да праблемы заражаных зямель», — сказаў на заканчэнне Мікалай Чаргінец.

**Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім ГІГІН** расказаў, што, калі БелТА і асабіста кіраўнік агенцтва звярнуліся да іх з не вельмі звычайнай прапановай аб правядзенні такой выстаўкі, згода была атрымана адразу. «Гэта супадае з нашым бачаннем таго, што адбываецца, і з нашым разуменнем, як цяпер павінны працаваць установы культуры. Тут вы бачыце гісторыю нашай краіны, калі частка нашага грамадства пайшла нейкім паралельным курсам, які завёў іх у тупік», — лічыць Вадзім Гігін. «Мы павінны ўсведамляць, які шлях прайшла так званая апазіцыя ад палітычных апанентаў улады і нават людзей ва ўладзе да адкрытых ворагаў народа, экстрэмістаў, якім вынесены абгрунтаваныя прысуды. І без гэтага асэнсавання не будзе работы над памылкамі. Як зрабіць так, каб не паўтарылася сітуацыя, калі частка грамадства становіцца на разбуральны для дзяржавы шлях», — падкрэсліў ён.

*Фотавыстава БелТА «Паралельныя светы» будзе працаваць на 22-м паверсе (аглядная пляцоўка) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з 17 да 21 студзеня. Уваход свабодны.*

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу**

**«Бакалея Гродно»**

**Аукцион состоится 09.02.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона. Начальная цена продажи, сумма задатка** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-97271 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 137,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084506801000509, площадью 0,1090 га (назначение – для размещения здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42.<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта – код 2.4, площадью 0,1090 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2.4, площадью 0,1090 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0010 га.<br>Обременения со стороны 3-х лиц:<br>- в виде аренды капитального строения, инв. № 400/С-97271 сроком по 31.07.2025 г.;<br>- от здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-97271, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42, подключено отопление и элекроснабжение к зданию специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-95222, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А.<br>Начальная цена продажи лота – 634 767,71 руб. (шестьсот тридцать четыре тысячи семьсот шестьдесят семь рублей семьдесят одна копейка) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 63 476 руб. (шестьдесят три тысячи четыреста семьдесят шесть рублей) |
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона. Начальная цена продажи, сумма задатка** | ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-95222 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 79,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А;<br>Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084506801000096, площадью 0,0841 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для эксплуатации и обслуживания магазина)), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0013 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0841 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2.4, площадью 0,0841 га.<br>Обременения со стороны 3-х лиц: отопление и электроснабжение здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-95222, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40А, подключено от здания специализированного розничной торговли с инвентарным номером 400/С-97271, расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 42.<br>Начальная цена продажи лота – 376 701,11 руб. (триста семьдесят шесть тысяч семьсот один рубль одиннадцать копеек) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 37 670 руб. (тридцать семь тысяч шестьсот семьдесят рублей) |
| Условия проведения аукциона: возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 0,8 % от конечной цены продажи объекта; срок заключения договора купли-продажи в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона.<br>Условия оплаты: 100 % предоплата в течение 14 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; передача имущества в течение 5 рабочих дней с даты полной оплаты стоимости имущества | |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 07.02.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.08.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

# СІЛА МАЛЕНЬКІХ КРОКАЎ



*Пачаць сённяшнюю калонку хочацца з малітвы аўтара «Маленькага прынца» Антуана дэ Сент-Экзюперы: «Госпадзі, я прашу не аб цудах і не аб міражах, а аб сіле кожнага дня. Навучы мяне мастацтву маленькіх крокаў»...*

*...Штораз перад Новым годам мы абавязкова штосьці сабе абяцаем, штосьці загадваем. Хтосьці адразу намячае здзейсніць нешта маштабнае: кардынальна памяняць работу, купіць абанемент у трэнажорную залу, каб скінуць 10 кілаграмаў, запісацца на курсы замежнай мовы. Я ж вырашыла пайсці па прыкладзе сваёй знаёмай, маці чатырох дзетак, і асвоіць майстэрства маленькіх крокаў. Паспрабаваць якасна палепшыць сваё жыццё без лішніх выдаткаў грошай і часу.*

*Сутнасць метаду ў тым, каб рэгулярна ісці да намечанай мэты, але вельмі маленькімі крокамі. Напрыклад, калі ў дзень вучыць хоць бы па пяць новых замежных слоў, то праз год можна засвоіць больш за 1800 слоў. Калі чытаць па 20 старонак у дзень, то за год можна прачытаць больш за 20 кніг сярэднім аб'ёмам у 350 старонак. Напрыклад, мая прыяцелька-пісьменніца пад Новы год паабяцала сабе больш займацца ўласнымі тэкстамі. І для гэтага зрабіла маленькі крок — прыдумала рубрыку для Instagram, якая будзе крыху ве дысцыплінаваць, — «Гісторыі ў суботу». Пачынаючы з 1 студзеня кожную суботу яна выкладвае кароткую гісторыю: скетч, фрагмент апавядання са свайго пісьменніцкага нататніка. Чым вельмі радуе мяне і іншых прыхільнікаў сваёй творчасці.*

*Шматдзетная мама Каця, пра якую я згадвала вышэй, вырашыла змяніць сваё жыццё да лепшага пры дапамозе карысных звычак. Яна склала для сябе спіс штодзённых мікраспраў — такіх маленькіх крокаў, на якія пастаянна чамусьці не хапае сіл. (Хоць, калі разабрацца, то яны займаюць не так ужо і шмат таго часу, некаторыя наогул некалькі хвілін.) А ёсць і такія — з частачкай «не» — то-бок тое, што трэба проста НЕ рабіць (напрыклад, адмовіцца ад цукру ў рацыёне ці не глядзець усе запар відэа ў Instagram), якія наогул яго эканомяць.*

*Дык вось, прайшло ўсяго два тыдні, а Каця сцвярджае, што маленькія, але рэгулярныя крокі, насамрэч здольныя тварыць цуды. Дзякуючы выкананню мікраспраў, накшталт практыкавання планкі па 3-5 хвілін, 10 хвілін на вывучэнне англійскай па мабільным дадатку ці простай маскі для твару на 15 хвілін (для гэтага нават не трэба спецыяльна выдаткоўваць час, можна паралельна рабіць нешта іншае) — адчуванне, што прадукцыйнасць павысілася ў разы. Больш за тое, адразу ж з'явілася дадатковая нагода пахваліць сябе за зробленае.*

*Вы ж, напэўна, не раз чулі (а можа, нават і самі казалі) фразу: «У мяне няма часу». Яна, насамрэч, як сцвярджаюць псіхолагі, пра расстаноўку прыярытэтаў, пра тое, што справа, на якую няма часу, мае меншы прыярытэт для вас, чым іншыя справы. І, ведаеце, што я заўважыла: вельмі часта часу не хапае менавіта на значныя і важныя рэчы. Таму, натхніўшыся прыкладам Каці, я таксама накідала невялікі спіс карысных звычак, якія хачу паступова ўвесці ў сваю паўсядзённасць. Сярод іх — кантрасны душ, шклянка цёплай вады раніцай нашча, ранішняя зарадка, хадзіць па лесвіцах пешкі, праветрываць пакой ды мазаць крэмам рукі перад сном, рабіць гімнастыку для твару, піць як мінімум 1,5 літра вады ў дзень, вучыць вершы, каб трэніраваць памяць. Штосьці з гэтага я ўжо і так раблю, але, на жаль, пакуль нерэгулярна.*

*Лічыцца ж, што для фарміравання новай звычкі трэба як мінімум 21 дзень рэгулярных паўтарэнняў дзеяння. Не забывайць аб пастаўленых мэтах дапаможа трэкер. Ён можа быць у выглядзе табліцы, намаляванай ад рукі на звычайным аркушы (лепш яе павесіць на бачнае месца), або дадатку на тэлефоне. Алгарытм просты: у трэкеры звычак указваем дзеянне (ці некалькі), якое трэба замацаваць, давесці да аўтаматызму, і кожны дзень ставім плюсік аб выкананні. Яшчэ адна карысная парада, ці лайфхак, ні цяпер модна казаць: калі хочаце адмовіцца ад цукру, не варта трымаць у доме цукеркі (замяніце іх на карысныя сухафрукты, мёд, бананы); калі хочаце кожны дзень чытаць — пакладзіце кнігу на бачнае месца. Бо, як казаў Альберт Эйнштэйн, самае вялікае глупства — рабіць усё тое ж самае і спадзявацца на іншы вынік. А яшчэ асабіста мяне на нейкія змены ў жыцці вельмі матывуе фраза Канфуцыя: «У чалавека два жыцці. Другое пачынаецца ў той момант, калі мы ўсведамляем, што жыццё ўсяго адно».*

***Надзея ДРЫНДРОЖЫК.***

Сямейная газета

Выпуск № 1 (226)

Тыя, хто побач

Таццяна ФІЛІМОНАВА:

# «Быць бацькамі — гэта вельмі цікава!»



**Часам здаецца, што ёсць людзі, якія ў сутках маюць не 24, а 48 гадзін. Інакш цяжка растлумачыць, як яны ўсё і ўсюды паспяваюць. Часцей за ўсё такая суперздольнасць сустракаецца ў жанчын, якія пабудавалі добрую кар'еру, стварылі сям'ю і пры гэтым цудоўна выглядаюць. Магчыма, сакрэт у тым, што пакуль адны скардзяцца на недахоп часу, такія жанчыны проста робяць сваю справу: працуюць, выхоўваюць дзяцей, даглядаюць сябе (хто сказаў, што гэта лёгка?). Таму і ўсё паспяваюць. Адна з такіх жанчын — Таццяна Філімонава, якая на нечым адным не спыняецца. У яе двайная пасада — намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму. І ў яе дзве дачкі-двайняты Ліза і Ангеліна. Свае рэцэпты таго, як спраўляцца з падвойнай адказнасцю дома і на працы, усюды паспяваць, Таццяна Філімонава расказала «Сямейнай газеце».**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Дочкі-маці

# ЖАНОЧАЕ ШЧАСЦЕ

## Як закласці яго аснову яшчэ ў дзяцінстве

**Як размаўляць з дзяўчынкамі аб іх рэпрадуктыўным здароўі, аб адносінах з супрацьлеглым полам? Мы заўсёды адны і тыя ж або нам уласціва мяняцца? Ці ёсць сувязь паміж харчовымі звычкамі, выбарам адзення, рэжымам дня і жаночым здароўем? Аб гэтым і не толькі размаўляем з дырэктарам Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля», аўтарам адукацыйнага праекта па захаванні рэпрадуктыўнага здароўя дзяўчынак-падлеткаў «Еве 13», культуролагам, мамай пяцярых дзяцей Веранікай СЯРДЗЮК і з лектарам-валанцёрам, кансультантам «Матулі» Таццянай СТАНКЕВІЧ.**

### Пра «вёску прывязанасці» і ўплыў блогераў

***— Ведаю, што асноўная ўвага «Матулі» накіравана на арганізацыю дапамогі мамам у цяжкай жыццёвай сітуацыі. Як атрымалася, што вы сталі праводзіць заняткі для дзяўчынак-падлеткаў?***

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Сапраўды, больш як 10 гадоў мы працуем у асноўным з крызісным мацярынствам, падтрымліваем жанчын у цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Акрамя таго, праводзім перадабортнае кансультаванне. І вельмі часта ад жанчын на кансультацыях чуем: «Чаму вы не прыйшлі да мяне раней, у школу, са сваёй інфармацыяй? Можа, тады я не дапусціла б столькі памылак у сваім жыцці». Пасля гэтых слоў я задумалася: «А чаму б не прыдумаць праграму для дзяўчынак-падлеткаў?» У выніку нарадзілася «Еве 13» — невялікі базавы курс з чатырох заняткаў. Мы яго рэалізоўваем пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя.



**Вераніка СЯРДЗЮК са сваёй малодшай дачкой на семінары.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# ЖАНОЧАЕ ШЧАСЦЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Чаму менавіта такая назва — «Еве 13»?***

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Ева — гэта зборны вобраз жанчыны. А 13 гадоў — сярэдні ўзрост першай менструацыі. У гэты перыяд дзяўчынцы вельмі важна атрымаць якасную інфармацыю, якая дапаможа ёй прымаць узважаныя рашэнні. Пачыналі з таго, што праводзілі заняткі ў царкоўных прыходах, нядзельных школах. Дзякуючы «сарафаннаму радыё» пра нас даведаліся і ў звычайных школах. Сёння супрацоўнічаем таксама з дружалюбнымі да падлеткаў цэнтрамі. Нас часта запрашаюць паразмаўляць пра тое, як сёння дзяўчыне захаваць сваё рэпрадуктыўнае здароўе, у студэнцкія інтэрнаты. Неабыякавыя мамы дамаўляюцца аб занятках з цыкла «Еве 13» для сваіх дачушак. Перад тым, як да нас прыйдуць дзяўчынак, мы збіраемся з бацькамі і выслухоўваем іх пажаданні, пытаемся, якія тэмы закрануць. Выбіраем матэрыял для размовы ў залежнасці ад узросту дзяўчынкі. Інфармацыю падаем без адмоўнай часціцы «не», бо ў падлеткавым узросце і так шмат адмаўлення.

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Вядома, адных толькі ўрокаў біялогіі недастаткова для рэпрадуктыўнага выхавання падлеткаў, ды і вельмі часта настаўнік пакідае іх для самастойнага вывучэння. Інфармацыі ў інтэрнэце шмат, як якаснай, так і не вельмі. Але ў дзяцей няма крытэрыяў адбору. Чым ярчэй пададзена тэма, тым ім здаецца праўдзівей, тым больш калі яна гучыць з вуснаў маладых блогераў. Падлеткі як губка ўсмоктваюць усё, што бачаць і чуюць. І наша задача — каб добрага, стваральнага побач з імі было як мага больш.

***— А ў ідэале хто павінен дзяўчынцы пра ўсё гэта расказваць?***

**Вераніка СЯРДЗЮК:** У ідэале, канешне, кожная мама павінна жыць у культуры прыняцця сябе, сваіх дзяцей, любові да ўсяго жаночага і атрымліваць ад гэтага задавальненне. І тады дзяўчынка будзе мець перад сабой добры прыклад для пераймання. Ёсць свята Бабін дзень. Здаўна ў праваслаўных краінах было прынята віншаваць 8 студзеня сваіх акушэрак. Жанчыны, якія нараджалі, збіраліся ў сваёй акушэркі, дарылі ёй салодкае, мыла, ручнікі. Ладзілі багаты стол, частаваліся, размаўлялі. Дзяўчынка, бачачы гэта, так ці інакш разумее, што ў мацярынстве ёсць штосьці ганаровае, сакральнае. У псіхалогіі лічыцца, што пра некаторыя інтымныя моманты сталення дзяўчынцы павінны расказваць не мама, а іншыя старэйшыя жанчыны з акружэння — цёткі, сёстры, хросная. І тут задача мамы, як раіць псіхолаг Гордан Ньюфелд, стварыць «вёску прывязанасці» — кола жанчын вакол дзяўчынкі, да якіх яна можа звярнуцца з любым пытаннем. І мы, педагогі-валанцёры, часта з'яўляемся гэтым колам. Да нас прыводзяць сваіх дачок сяброўкі, знаёмыя.

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Далёка не ўсе бацькі адчуваюць сябе кампетэнтнымі ў тым, каб размаўляць з дзецьмі на такія далікатныя тэмы, многія проста не ведаюць, што і як трэба казаць дочкам. Мне пашанцавала, са мной размаўляла не толькі мама, але і бабуля, яны знаходзілі патрэбныя словы. І сёння, маючы дзвюх уласных дачок, я разумею, што гэта размова павінна пачынацца не ў падлетквым узросце, а значна раней. Бо па ўзроставай псіхалогіі каштоўнасць сям'і закладваецца задоўга да падлеткавага ўзросту. Нават чытаючы беларускія народныя казкі сваім дзецям, можна ненавязліва і далікатна займацца палавым выхаваннем.

**Вераніка СЯРДЗЮК:** У нас у «Матулі» перыядычна праходзіць семінар «Дочкі-маці», дзе мы расказваем мамам, як правільна размаўляць з дочкамі на важныя і няпростыя тэмы. У цёплай, даверлівай атмасферы абмяркоўваем тонкасці выхавання дзяўчынкі пубертатнага перыяду. Размаўляем пра тое, калі расказваць дачцэ аб зменах у арганізме, якія яе чакаюць. Як адказваць на нязручныя пытанні і падлеткавыя правакацыі. Што нармальна і фізіялагічна ў падлеткавым узросце. Як не сумна гаварыць аб рэжыме і правільным харчаванні. Наколькі глыбока пасвячаць у пытанні цыкла і плоднасці. І мы вельмі радуемся, калі жанчыны прыходзяць, каб знайсці адказы на падобныя пытанні, бо не хочуць страціць сувязь са сваімі дочкамі.



Таццяна СТАНКЕВІЧ (*у цэнтры*) праводзіць заняткі «Еве 13».

**Праект «Еве 13» летась быў адзначаны дыпломам фіналіста Міжнароднага конкурсу «Святасць мацярынства — 2023» у намінацыі «Найлепшая камандная работа па арганізацыі асветніцкай дзейнасці».**

## Пра цыклапацэркі і Дзюймовачку

***— Падлеткі — спецыфічная аўдыторыя, каб прыцягнуць іх увагу, зацікавіць, напэўна, трэба прыкладці нямала намаганняў?***

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Менавіта таму мы і выкарыстоўваем шмат інтэрактыўных момантаў. Стараемся, каб дзяўчынкам на нашых занятках было не толькі карысна, але і цікава. У нас няма ніякіх сухіх лекцый, запужванняў. На кожны занятак прыносім з сабой рэчы, якія дзеці могуць памацаць. Напрыклад, цыклапацэркі. Гэта самы старажытны жаночы каляндарык. Нанізваючы шкляныя ці драўляныя шарыкі на нітачку, дзяўчынкі даведваюцца, што кожны дзень, у залежнасці ад перыяду цыкла, мяняецца іх самаадчуванне і настрой, вучацца назіраць за сабой і кантраляваць эмоцыі. Сёння, вядома, ёсць сучасныя мабільныя дадаткі, і мы пра іх таксама расказваем на занятках. Але мы хочам, каб не дадатак казаў дзяўчынцы, калі ў яе будзе менструацыя, а каб яна сама разумела, бо гэта дапамагае планаваць сваё жыццё больш эфектыўна. Напрыклад, бліжэй да авуляцыі, калі энергія на піку, браць на сябе дадатковыя здзяйсненні, а ў апошні тыдзень перад менструацыяй дазваляць сабе больш прагулак і адпачынку. Гэтыя веды пра сябе дапамогуць у будучыні пазбегнуць лішніх непаразуменняў ды канфліктных сітуацый у сям'і.

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Для старшакласніц і студэнтаў праводзім гульню «Толькі факты». Кожны выцягвае паперку з фактам па дэмаграфіі Беларусі (напрыклад, гэта можа быць інфармацыя пра сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб ці аб колькасці абортаў і г. д.). Затым па чарзе падлеткі агучваюць тое, што выцягнулі, і выказваюць свае меркаванні: добра гэта ці дрэнна. Калі нашы погляды супадаюць, я як мадэратар кажу: «Цудоўна, што нашы каштоўнасці супадаюць. Я таксама так лічу». Калі ж не супадаюць, то прапаную ім іншы пункт гледжання і кажу: «Падумайце пра гэта ў вольны час».

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Дзецям на прыкладзе макетаў эмбрыёнаў у натуральную велічыню паказваем, як малое развіваецца ўнутры маткі. Падаём гэты орган праз накрыты стол, утульны домік для малога, вяртаемся да старажытнага слова «ўлонне». Акцэнтуем іх увагу: каб той домік быў зручным, каб дзіця было ў ім у бяспецы і атрымлівала ўсё неабходнае, пачынаць клапаціцца пра жаночае здароўе трэба ўжо цяпер. А для гэтага важна з павагай ставіцца да сябе і свайго арганізма, абараняць свае органы ад пераахалоджвання і неабдуманых паводзін. Дзяўчынкі павінны ведаць, што іх рэпрадуктыўная сістэма яшчэ дастаткова кволая, яе фарміраванне завяршаецца да 21 года. Дзіцячыя гінекалагі, з якімі мы часта працуем у тандэме, кажуць: «Мы б гаварылі сваімі медыцынскімі тэрмінамі і дзецям было б сумна, палову б не зразумелі». У нас жа размова пабудавана на простых, зразумелых дзецям асацыяцыях, прыкладах, вобразах. Жаночы цыкл параўноўваецца з чатырма порамі года, яйцаклетка — з Дзюймовачкай, якая сама свядома выбірае сабе жаніха. На занятках звяртаемся да народных традыцый, фальклору, напрацаванага нашымі мудрымі продкамі. Дзякуючы дапамозе Акадэміі навук Беларусі, куды мы рабілі запыт, у нас цяпер ёсць цэлая калекцыя беларускіх прыказак і прымавак, у якіх заключаны сакрэты сямейнага шчасця. Мы разбіраем іх на ўроку разам з дзецьмі, просім паразважаць над значэннем. Ладзім элементы абрадаў, напрыклад, такіх як «Дзяжа» — аб каштоўнасці чысціні і дзявоцкасці. Таццяна часта праводзіць заняткі ў нацыянальным строі. Любяць дзеці разглядаць традыцыйную беларускую ляльку «дзеўка-баба». З аднаго боку палачкі там дзяўчына, а пераварочваеш — ужо замужняя жанчына, маці. Мы тлумачым, што дзве лялькі знаходзяцца на адной палачцы, бо ад таго, як ты сябе павядзіш у дзявоцтве, залежыць тваё жаночае здароўе і шчасце».

## Пра празмерную худзізну і цноту

***— Вы цэлы занятак прысвячаеце харчаванню, гігіене і адзенню дзяўчынкі...***

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Гэта вельмі важная размова, бо рэгулярнасць менструальных цыклаў напрамую залежыць ад таго, які лад жыцця мы вядзём: што ядзім і п'ём, калі кладзёмся спаць, колькі рухаемся. Адкрыццём для многіх дзяўчынак і для іх мам з'яўляецца тое, што проста наладжванне рэжыму харчавання прыводзіць да нармалізацыі цыкла. Многія падлеткі засмучаюцца, даведаўшыся, што іх любімыя чыпсы, шакаладныя батончыкі і газіроўка не дадаюць ім здароўя, але задумваюцца. Размаўляем з дзяўчынкамі і пра негатыўны ўплыў на здароўе празмернай худзізны. З-за навамодных дыет і імкнення да стэарэатыпнага знешняга выгляду могуць з'явіцца парушэнні цыклаў, бо, каб працавалі экстрагены, неабходны тлушчавыя тканкі. Падлеткавы ўзрост — час, калі актыўна растуць і развіваюцца органы, якія адказваюць за працяг роду. У гэты перыяд вельмі важны добры прыток крыві да даспяваючых органаў і адсутнасць інфекцый, здольных разбурыць настройку ўсіх сістэм. Мы расказваем дзяўчатам пра небяспечнае адзенне — якое парушае кровазварот, спрыяе размнажэнню бактэрый. А таксама пра шкоду штодзённых пракладак ды сродкаў для інтымнай гігіены — апошнія забіваюць не толькі шкодныя, але і карысныя бактэрыі, парушаючы інтымную мікрафлору. Гэтыя сродкі варта мінімізаваць ці выключыць. Для многіх становіцца адкрыццём, што для належнага догляду дастаткова праточнай вады, пры неабходнасці можна выкарыстоўваць адвары рамонку, каляндулы, натуральнае мыла на аснове раслінных алеяў.



**Вераніка СЯРДЗЮК:** Са старшакласнікамі і студэнтамі, а таксама іх бацькамі мы размаўляем і пра негатыўны ўплыў на здароўе дзяўчыны і жанчыны гарманальных кантрацэптываў і ў цэлым гарманальнай тэрапіі. Мы з Таццянай, акрамя ўсяго, выкладаем яшчэ і натуральныя метады, якія дапамагаюць мужу і жонцы адкласці зачацце дзіцяці або, наадварот, вызначыць найлепшы момант для гэтага. Нам хацелася б, каб беларускія гінеколагі навучаліся гэтым метадам і маглі б перадаваць веды сваім пацыентам.

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Адна дзяўчына пасля занятку паднялася і сказала: «Як добра, што з намі пра гэта хтосьці размаўляе!» Другая падышла і папрасіла: «А можна я вас абдыму?» Дзяўчаты-падлеткі адчуваюць шмат таго, што раней не адчувалі. Яны перажываюць, ці нармальныя гэтыя адчуванні. І ім часта няма з кім гэта абмеркаваць. Мама з радасцю супакоіла б, але, магчыма, ведаў не хапае, смеласці. Таму пасля занятку ў іх такое аблягчэнне: «Усё, што я адчуваю, гэта нармальна». Яны пачынаюць разумець, што ўся справа ў фарміраванні гарманальнага фону, і гэта часова.

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Вельмі часта да нас пасля заняткаў падыходзяць падлеткі і кажуць: «Вы першыя дарослыя, якія пагаварылі з намі пра ГЭТА». Мне здаецца, мы не павінны пакідаць нашых дзяцей у інфармацыйным вакууме наконт цноты. Ёсць даследаванне амерыканскага інстытута сям'і аб уплыве колькасці палавых партнёраў да шлюбу на яго ўстойлівасць. У жанчын, якія захоўваюць цноту да шлюбу, колькасць захаваных сем'яў складае 80 %. І з кожным новым палавым партнёрам жанчыны страчваюць гэту здольнасць. Калі гэта быў адзін мужчына і нават будучы муж — гэта ўжо 54 %. Трэба казаць нашым дзецям пра «цноту, якая дзявочае шчасце беражэ» як пра здароўезберагальную стратэгію, гарантыю таго, што не будзе непажаданай цяжарнасці, захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам. Наша задача хоць бы расказаць, што так можна.

**Таццяна СТАНКЕВІЧ:** Мы разумеем, што адных нашых заняткаў недастаткова, каб ахапіць усіх школьніц. Таму было б цудоўна, калі б настаўнікі рускай і беларускай літаратуры, сусветнай мастацкай культуры, калі праходзяць нейкі мастацкі твор ці разглядаюць карціну ў рамках школьнай праграмы, акцэнтавалі б увагу дзяцей і на чысціні кахання, на мацярынстве. Гэта немагчыма зрабіць прымусова, тут усё залежыць ад настаўніка. Дасведчаны педагог інтуітыўна адчуе і знойдзе, дзе зрабіць невялікі акцэнт, які застанецца ў дзіцячай памяці і стане важным урокам фарміравання сямейных каштоўнасцяў.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Канстанціна ВЕКА і з сямейнага архіва Веранікі СЯРДЗЮК.**

# «Быць бацькамі — гэта вельмі цікава!»



### Час знаходзіцца на ўсё, што сапраўды важна

— Ад прыроды жанчына вельмі моцная. Нездарма яна выношвае, нараджае дзяцей, потым іх гадуе. І мноства жанчын, у якіх не двое, як у мяне, дзяцей, а скажам, чацвёра, сумяшчаюць і сям'ю, і кар'еру, і ўсюды паспяваюць. Насамрэч, сёння лёгка ўсё сумяшчаць. Тым больш калі ёсць памочнікі ў выглядзе робата-пыласоса, пральнай і пасудамыечнай машын. У нашых мам і бабуль нічога гэтага не было, але яны працавалі і выхоўвалі дзяцей, якія выраслі дастойнымі людзьмі. Таму я перакананая: час можна знайсці на ўсё, было б жаданне.

Мне, можа, было больш складана, таму што ў мяне адразу з'явілася дзве дзяўчынкі. Маці, якія нарадзілі адразу двух дзяцей, зразумеюць, пра што я кажу. Прасцей вырасціць чацвёра дзяцей, якія адзін за адным нараджаюцца, чым вырасціць двайнят. Адна засынае — другая пачынае плакаць, кожнай патрэбны максімум увагі. Тым не менш, калі маім дзяўчынкам споўніўся адзін год, я паспяхова выйшла на працу. Вялікі дзякуй маёй маме, якая працавала ў школе, за выслугу гадоў датэрмінова выйшла на пенсію і дапамагала мне з дзецьмі. Было складана, былі бяссонныя ночы, дзеці хварэлі. Але з усім справіліся. І сёння я магу сказаць, што ўсё пасільна. Выгадаваць дзяцей па сілах любой жанчыне, і гэта зусім не гераізм.

Дзеці — гэта вялікае шчасце. Я цудоўна памятаю свае адчуванні ў першыя дні мацярынства. Каля месяца я зведвала адчуванне абсалютнага шчасця. Гэта немагчыма перадаць словамі, гэта можна толькі адчуць. Так, цяжка, дзеці не спяць, плачуць, фізічна сябе не вельмі добра адчуваеш. Але і бяссонныя ночы, і стомленасць, і фізічны боль — усё адыходзіць на другі, а то і на чацвёрты планы. У гэты перыяд жанчына ў прамым сэнсе гэтага слова лятае на крылах. Я добра памятаю, што мне ў той момант усе людзі здаваліся вельмі прыгожымі, я была рада бачыць кожнага прахожага. Адзіны раз у жыцці зразумела, што такое абсалютнае шчасце — калі нарадзіліся дзеці. А калі ты шчаслівы, то ўсе цяжкасці па плячы. А потым дзеці падрастаюць, і маці становіцца прасцей у бытавым плане, яна можа выйсці на працу.

Галоўнае, не несці працоўныя перажыванні дадому. У мяне быў вельмі добры прыклад — мой бацька. Ён працаваў усё жыццё дырэктарам школы, зразумела, што было няпроста. Але ён умеў, пераступаючы парог дома, забывацца, што ёсць такія праблемы. Ён станавіўся бацькам, мужам. Мусіць, яго асабісты прыклад на мяне паўплываў. Мне ніколі не даводзілася прыкладаць намаганні, каб з кіраўніка пераключыцца на ролю маці і жонкі.

Любая маці адчувае сваіх дзяцей як ніхто іншы і разумее, як сябе з імі паводзіць, дзе трэба быць больш строгай, дзе трэба пашкадаваць. Гаворыцца, што дасць Бог дзіця, дасць і на дзіця. Маецца на ўвазе матэрыяльны аспект. Але я аднесла б гэта і да выхавання: калі Бог дае жанчыне дзіця, то яна ўжо сама на падсвядомым узроўні ведае, як правільна сябе паводзіць з дзіцем. У мяне быў цікавы выпадак у радзільні: праз тры дні пасля родаў да мяне ў палату нясмела пастукала зусім маладзенькая дзяўчынка, гадоў 18 максімум. Ёй першы раз прынеслі яе малога, і яна не ведала, што з ім рабіць. Мы пачалі размаўляць, і яна зразумела, што ўсё цудоўна ведае. Мацярынскі інстынкт — вельмі моцная рэч. Мама — яна заўсёды мама, яна ведае, як выхоўваць дзіця, якія словы падабраць, калі трэба ўсміхнуцца. Гэта невытлумачальна, але гэта факт.

### Быць мамай лёгка, калі побач надзейны мужчына

Сёння многія мужчыны замест жонкі ідуць у дэкрэтны адпачынак. І я стаўлюся да гэтага вельмі станоўча. Асноўная нагрузка па выношванні, нараджэнні дзіцяці кладзецца на плечы жанчыны. І так склалася, што менавіта яна павінна дагледзець, выхоўваць дзіця. Але калі ў жанчыны ёсць добрая высокааплатная праца, магчымасць кар'ернага росту, а ў мужчыны такога няма, навошта ёй на тры гады выпадаць з рытму, калі гэтыя тры гады глядзець дзіця можа тата? Тым больш што ў маці і дзіцяці ёсць сувязь ад прыроды, а бацьку трэба яе ўстанаўліваць. І калі мужчына будзе з нараджэння глядзець дзіця, то яны ў будучым будуць яшчэ бліжэйшымі. Асабліва, калі ў сям'і нарадзіўся хлопчык. Дзіця як губка ўсё ўбірае, і калі яно бачыць дужага сур'ёзнага тату, то само такім становіцца. Гэта нармальна, гэтага не трэба саромецца. Сярод маіх знаёмых ёсць сур'ёзныя мужчыны, якія пайшлі ў дэкрэт і паспяхова выхоўваюць дзяцей. І гэта вельмі моцныя, надзейныя мужчыны.

### Галоўны сакрэт — асабісты прыклад

Калі б мяне спыталі, што самае складанае ў жыцці, я, не задумваючыся, сказала б, што выхаваць дастойнага чалавека, сумленнага, шчырага, сапраўднага патрыёта, як бы пафасна гэта ні гучала. Так, нашым бабулям было цяжэй у бытавым плане, але з пункту гледжання выхавання ім было прасцей. Дзеці з малога ўзросту дапамагалі па гаспадарцы, яны ведалі, што такое праца, мелі больш зносін са старэйшымі, больш кніг чыталі. А сёння дзеці жывуць у інтэрнэце і бачаць увесь бруд, які яго запаланяе штодня. Таму сучасным бацькам вельмі цяжка растлумачыць, што такое добра, а што такое дрэнна, знайсці правільныя падыходы да сваіх дзяцей. Я з гэтым сутыкнулася ў 2020 годзе. Мае дзяўчынкі тады вучыліся ў чацвёртым класе. Вучням чацвёртага класа па 10 гадоў, гэта ўжо амаль падлеткі, са сваім меркаваннем, з імі ўжо няпроста. І я ганаруся сваімі дзецьмі: у тыя неспакойныя часы яны не пайшлі за «нязгоднымі» аднакласнікамі, не пагаджаліся з імі, адстойвалі сваё меркаванне. Мы з мужам не стаялі над імі з рамнём, нічога ім не забаранялі. Дзеці проста чулі, аб чым мы размаўлялі дома, што абмяркоўвалі; калі ўзніклі пытанні — мы даступна і шчыра ім тлумачылі, што да чаго. Можа быць, ім лягчэй, бо іх двое. Яны падобныя да мяне, яны ўмеюць адказаць, не баяцца за сябе пастаяць. Дзеці як губкі ўсмоктваюць усё, што робяць бацькі. Таму, калі хочаце выхаваць прыстойнага чалавека, варта пачаць з сябе.



### Не варта шкадаваць душэўнае цяпло

Быў час, калі я працавала загадчыцай аддзялення псіхолага-педагагічнай дапамогі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Працавала з дзеткамі-інвалідамі, з дзеткамі з неўладкаваных сем'яў, і я бачыла, як ім патрэбна дапамога. Тры гады таму наш прафсаюз узяў шэфства над Сенненскім дзіцячым домам, сёння там выхоўваецца 83 дзіцяці. Я стараюся рэгулярна да іх прыязджаць, абавязкова на Новы год, Дзень аховы дзяцей і 1 верасня. Для гэтых малых важныя не падарункі, для іх вельмі важна, каб іх абнялі, важна адчуць цеплыню мамы. Яны разумеюць, што я не іх маці. Але ім вельмі важна разумець, што яны такія ж, як усе, што іх любяць. У гэтым годзе ў рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» мы пастараліся падарыць ім цуд. Папрасілі кіраўніцтва запісаць відэаролік з кожным дзіцем, дзе выхаванец звяртаецца да Дзеда Мароза, бо Дзед Мароз ніколі не выконваў жаданні гэтых дзяцей. Яны запісалі ўсіх дзяцей, хто мог агучыць свае жаданні. Зусім малым мы падарылі добрыя мяккія цацкі, салодкія падарункі. Усе відэа мы выклалі ў сваіх сацыяльных сетках. Нашы пярвічкі адгукнуліся і размеркавалі, якому дзіцяці хто купляе падарунак. Самае цікава, што дзеці не прасілі чагосьці неверагоднага. Іх жаданні цалкам рэальныя, у хлопчыкаў — спартыўны касцюм, бутсы, футбольныя мячы, у дзяўчынак — фены, адпарвальнік, сумачкі. І напярэдадні Каляд, каб падоўжыць дзецям свята, мы прывезлі ўсё, што яны хацелі. У дзіцячым доме ёсць вельмі таленавітыя дзеці, здольныя спартсмены. Таму мы часта прыязджаем да іх разам са студэнтамі ўніверсітэта культуры ці ўніверсітэта фізкультуры. Яны расказваюць дзецям пра сваю вучобу, запрашаюць паступаць у свае ўніверсітэты. У сям'і дзяцей на правільную дарогу накіроўваюць бацькі, а ў дзіцячым доме не заўсёды ёсць каму гэта зрабіць. Таму мы стараемся дапамагчы і справай, і парадай. І гэта зусім не складана.

### Бацькі развіваюцца разам з дзецьмі

Знешне мае дзяўчынкі падобныя да мужа — бландзінкі з блакітнымі вачыма. Але характарамі яны пайшлі ў мяне. І мне гэта падабаецца. Я нарадзілася ў сям'і вясковых настаўнікаў, усяго ў жыцці дасягала сама, бо ніхто б мне нічога на талерачцы не прынёс. І я хацела, каб мае дзяўчынкі былі такімі ж мэтанакіраванымі, рашучымі. Муж у мяне таксама вельмі мэтанакіраваны, але ён па тэмпераменце больш флегматык. А я лічу, што дзяўчына павінна быць своеасаблівым генератарам, рухацца наперад, пастаянна развівацца. Мае дочкі так і робяць. Яны займаліся плаваннем, фігурным катаннем, лёгкай атлетыкай, хадзілі ў Нацыянальную школу прыгажосці, ужо не першы год займаюцца конным спортам. Здавалася б, як за 12 гадоў можна столькі паспець? Але я як маці шчаслівая, што яны многім цікавяцца і ўсебакова развіваюцца. І ўжо відаць, што яны ідуць да сваёй мэты, яны яе яшчэ не намацалі, але ўжо ёсць жаданне знайсці яе і дасягнуць.

Дзеці прымушаюць і бацькоў развівацца і самаўдасканальвацца. Калі дзяўчынкі былі на трэніроўцы па плаванні, я займалася ў суседнім басейне. І цяпер плаваю даволі нядрэнна. Сёння займацца конным спортам я б не рызыкнула. Але пачала зусім па-іншаму глядзець на коней, ужо разбіраюся ў масці і гляджу інакш на гэтых жывёл. Думаю, што, калі б не было ў мяне дзяцей, я нічога не ведала б пра фігурнае катанне, пра лёгкую атлетыку, пра плаванне і многія іншыя заняткі.

### Найлепшая матывацыя для бацькоў

Пакуль у мяне не было дзяцей, я нават не сумнявалася, што маю сэнс жыцця. Цяпер мне смешна ад таго, што я тады лічыла, быццам ведаю, як трэба жыць і што трэба рабіць, што для мяне галоўнае, а што — не. Але толькі калі ў мяне з'явіліся дочкі, я зразумела, што галоўнае ў жыцці. Я зразумела, як мне выбудоўваць свой жыццёвы шлях. У мяне з'явіўся стымул, бо ад мяне цяпер залежаць яшчэ два лёсы. Дзеці прыўносяць у наша жыццё перамены, якія, на першы погляд, з дзецьмі зусім ніяк не звязаныя. Прывяду прыклад. Да нараджэння дзяцей я зусім не захаплялася кветкаводствам. Ад бацькоў дастаўся дом за горадам — увесь участак мы з мужам засадзілі газонам, нават думаць аб кветках не хацела. Але нарадзіліся дзяўчынкі, і я зразумела, што яны павінны расці ў прыгажосці. Разбіла адну невялікую клумбу... Прайшло 12 гадоў, а я не магу спыніцца, хутка на ўчастку не застанецца вольнага месца, дача патанае ў кветках. На мясцовым рынку мяне ведаюць усе прадаўцы кветак, я скупляю ўсё, што ёсць у продажы. У мяне растуць кветкі дома і на працы. І я не магу супакоіцца, мне хочацца, каб маёй сям'і было ўтульна.

Быць бацькамі — гэта вельмі цікава, гэта значыць пастаянна развівацца. І вяртаючыся да пачатку, адзначу, што праца бацькоўству зусім не перашкода. Дзеці даюць стымул на больш прадукцыйную працу. Разумееш, для каго стараешся, навошта працуеш, хочацца зрабіць свой уклад у тое, каб краіна развівалася. Прэзідэнт часта паўтарае, што кожны чалавек на сваім рабочым месцы робіць унёсак у развіццё краіны. А якія бацькі не жадаюць светлай будучыні для сваіх дзяцей?! Я лічу, што ў кожнай сям'і павінны быць дзеці, таму што гэта самы сур'ёзны стымул старацца рабіць добра не толькі сваёй сям'і і сваёй хаце, але і сваёй краіне. Асабліва ў цяперашняй няпростай сітуацыі. Сёння, мне здаецца, кожны чалавек разумее, што мір — гэта самае галоўнае. І калі дарослы можа пра сябе не вельмі перажываць, то няма такіх бацькоў, якія не перажывалі б за сваіх дзяцей і не хацелі б для іх добрай будучыні.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ВАЙНА І МІР УНУТРЫ СЯМ'І

## Чаму людзі сварацца і як захаваць шлюб?

**ПАВОДЛЕ статыстыкі, ледзь ці не палова шлюбаў заканчваюцца разводамі. Першая «ластаўка» будучага крушэння сямейнай лодкі — гэта, вядома, сваркі. Нават сярод тых, хто здолеў захаваць шлюб на ўсё жыццё, адсвяткаваўшы не толькі «залатое», але і «дыяментавае» вяселле, не знойдзецца пар, якія здолелі б на працягу ўсяго гэтага часу ні разу не пасварыцца.**

**Ці трэба баяцца сямейных сварак? У якой сітуацыі неабходна ўсвядоміць, што дрэнны мір лепшы і як пераадольваць наступствы сямейных канфліктаў?**

### Важкія прычыны

Сваркі — гэта, вядома, непрыемна, але без іх, на жаль, ніхто і ніколі не абыходзіцца. Больш за тое, не выключана, што менавіта дзякуючы сваркам сям'я можа стаць мацнейшай. З гэтага не вынікае, што сваркі трэба раздзімаць спецыяльна, але ставіцца да канфліктаў варта ўсё ж такі спакайней.

**Часам канфлікты вядуць да больш сумленнага і адкрытага дыялогу: мы разумеем, што ёсць нейкія моманты ў нашым жыцці, якія патрабуюць увагі і рашэння.**

Падрабязна разгледзім прычыны неразумення паміж мужам і жонкай.

— Яны могуць насіць эмацыянальна-псіхалагічны характар або быць абумоўленымі бытавым бязладдзем. Часта большасць сварак звязана з нядольнасцю прыстасоўвацца да змен у жыцці, радзей — з адсутнасцю аб'ектыўных спосабаў зняць напружаную атмасферу падчас прывыкання да новых умоў, — расказвае псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Дзмітрый Швец.

Прычын для сварак можа быць вельмі шмат, але тое, што іх аб'ядноўвае, — немагчымасць выйсці з канфлікту якім-небудзь іншым, больш канструктыўным чынам. Звычайна сваркі з'яўляюцца вынікам таго, што эмоцыі пераважваюць здольнасць думаць і разважаць адзін з адным аб тым, што адбываецца. Стомленасць, эмацыянальная няўстойлівасць, моцныя пачуцці — гнеў, роспач, бездапаможнасць, страх у спалучэнні з зацяжным канфліктам, хутчэй за ўсё, выльюцца ў сварку як у спосаб разрадкі вострых перажыванняў.

Сярод асноўных прычын канфліктаў у сям'і — розныя погляды на сумеснае жыццё. Важную ролю адыгрываюць мадэлі мужа і жонкі, якія былі зададзены бацькамі (хто дамінаваў, ад каго залежаў асноўны даход і інш.). Калі яны абсалютна розныя, гэта можа стаць падставай для пастаянных сварак.

Няўменне своечасова агучыць свае прэтэнзіі таксама нярэдка прыводзіць да сямейных скандалаў. Тут дзейнічае прынцып «раздзімання мухі да памераў слана». Своечасова не выказаная незадаволенасць з нагоды незакрытага цюбіка пасты пазней можа выліцца ў вялізны скандал, дзе назапашаныя крыўды як снежны ком абрынуцца на аднаго з членаў сям'і.

Непавага ў адносінах адзін да аднаго, несумненна, рана ці позна стане прычынай сварак. У момант прыціркі зніжаецца ступень павагі, што можа пераходзіць у прыніжэнне і хамства. Негатыўнае стаўленне да партнёра, нядольнасць яго зразумець заўсёды прыводзяць да сваркі.

Сярод прычын канфліктаў — розныя духоўна-маральныя арыенціры, процілеглыя асаблівасці тэмпераменту, недавер і рэўнасць.

Псіхолагі ўстанавілі, што бытавыя прычыны рознагалоссяў у сям'і адыгрываюць не такую значную ролю, як эмацыянальна-псіхалагічныя. Але ўсё роўна пра гэтыя фактары не варта забываць. Да іх адносяць матэрыяльныя праблемы — недахоп грошай, істотная розніца ў даходах, завышаныя матэрыяльныя амбіцыі і немагчымасць іх задавальнення. Таксама гэта жыллёвыя цяжкасці: адсутнасць жылля, пастаянныя пераезды, пражыванне з бацькамі,



невыкананне сваіх абавязкаў па доме. Сюды ж можна дадаць выхаванне дзяцей — розныя стылі і метады, якім аддаюць перавагу бацькі. Безумоўна, псуюць сямейную атмасферу шкодныя звычкі — алкагалізм, наркаманія і іншыя, якія не дазваляюць весці нармальны лад жыцця. Да гэтай жа праблемы адносіцца і нежаданне мяняць сябе.

**Своечасова не выказаная незадаволенасць з нагоды незакрытага цюбіка пасты пазней можа выліцца ў вялізны скандал, дзе назапашаныя крыўды як снежны ком абрынуцца на аднаго з членаў сям'і.**

### Крызісныя перыяды

Кожная сям'я праходзіць праз чатыры асноўныя крызісныя перыяды. Першы здараецца, як правіла, на першым годзе шлюбу. Прычына большасці канфліктаў — пошук агульнай мовы, прыцірка адзін да аднога, якія могуць пагаршацца матэрыяльнымі і жыллёвымі праблемамі. Лічыцца, што на першым годзе сумеснага жыцця адбываецца самая вялікая колькасць разводаў. Паспяхова пераадолеўшы першы этап прыціркі адзін да аднаго, людзі расслабляюцца.

Але якраз расслабляцца і не варта, бо наперадзе — яшчэ адзін крызіс, звязаны са з'яўленнем дзяцей і зменай сацыяльных роляў. Партнёры з мужа і жонкі пераходзяць у бацькоў, што накладвае цэлы шэраг новых абавязкаў і вялікую адказнасць, адбываецца ўшчамленне патрэб, рознагалоссі наконт выхавання дзяцей. У гэты час назіраецца першае астуджэнне ў адносінах да партнёра. Людзям становіцца сумна ў адносінах, таму канфлікты непазбежныя.

Наступная крызісная пара — пасля 10—15 гадоў у шлюбе. Адбываецца згасанне пачуццяў, перанасычэнне бытавым жыццём, абвастрэнне супярэчнасцяў з падрастаючымі дзецьмі. Канфлікт паміж мужам і жонкай часта завяршаецца разводам, бо пасля дзесяцігадовай мяжы большасць пар сутыкаецца з рэальным астуджэннем у адносінах да партнёра і немагчымасцю вырашыць праблемы, якія так ці інакш узнікаюць у шлюбе.

Яшчэ адзін небяспечны перыяд — пасля 20 гадоў сумеснага жыцця. Узмацняюцца трывогі з нагоды здрад, недавер партнёраў, з'яўляецца сіндром «апусцелага гнязда», калі дзеці выраслі і жывуць самастойна.

### Лепш дрэнны мір

Ці трэба пазбягаць сварак? Па магчымасці так. Сварка кажа аб тым, што канфлікт дасягнуў вострага эмацыянальнага піку. І нават калі пазбегнуць яе не атрымліваецца, то дзякуючы канфлікту мы можам зразумець, што стаіць за сваркай і як нам быць далей. Часам канфлікты вядуць да больш сумленнага і адкрытага дыялогу: мы разумеем, што ёсць нейкія моманты ў нашым жыцці, якія патрабуюць увагі і рашэння. Калі за сваркай не стаіць жаданне прычыніць іншаму боль спецыяльна, то яна часта дапамагае нам лепш зразумець адно аднаго, вывесці на паверхню нейкія непрыемныя ўнутраныя гісторыі і падумаць, як быць далей.

Але часта наступствы лакальных сутыкненняў маюць негатыўны характар. Яны моцна адбіваюцца на псіхічным і фізічным здароўі ўсіх, хто жыве ў адным доме. Перш чым злавацца на жонку, падумайце, ці не пашкадуеце вы пра гэта, бо прычыненая рана ад каханага чалавека вельмі доўга гоіцца і часам не зажывае ніколі. Парушаюцца адносіны паміж мужам і жонкай, з'яўляюцца крыўды, недавер, паступова само існаванне сям'і губляе сэнс, што прыводзіць да непазбежнага разводу.

Сваркі адмоўна адбіваюцца на неакрэплай псіхіцы дзіцяці. Яно цяжка ўспрымае негатыўнае стаўленне бацькоў адзін да аднаго і потым усё праецыруе на сябе, лічачы, што само з'яўляецца галоўнай прычынай разладу. Гэта накладвае вялізны адбітак на ўсё, што дзіця робіць, якім яно будзе ў далейшым.

Каб пазбегнуць гэтых негатыўных наступстваў, лепш не даводзіць да сваркі, устараняючы ўсе рознагалоссі мірным шляхам. Памятайце, як у прымаўцы: дрэнны мір лепшы за добрую сварку. Але калі ўсё ж гэта не ўдаецца, ёсць пэўныя прыёмы, з дапамогай якіх можна папярэдзіць развіццё недапушчальнага сцэнарыя.

### Крокі насустрач

Каб у доме panавалі каханне і ўзаемаразуменне, а ўсе непаразуменні вырашаліся толькі ў канструктыўным кірунку, кожны партнёр павінен пастарацца і прыкласці максімум намаганняў.

Найперш умець гаварыць пра свае перажыванні і слухаць партнёра. Іншага спосабу, акрамя як спрабаваць асэнсоўваць і пераварваць тое, што адбылося між людзьмі, няма.

— Важна навучыцца цярпенню, старацца ўспрымаць партнёра як самога сябе, апускаючы недахопы, стаць часткай іншага. Варта супераважываць, не ігнараваць і не прыніжаць яго асобу, а паспрабаваць уважліва выслухаць і зразумець. Трэба ўмець дамаўляцца і ісці на кампрамісы. Важна памятаць, што заўсёды ёсць спосаб паляпшэння сітуацыі, якой бы складанай яна ні была. Калі муж і жонка гатовы разам знаходзіць выхад, а не вінаваціць адно аднаго, то ў іх усё абавязкова атрымаецца, — кажа Дзмітрый Швец.

Каб вырашыць сямейны канфлікт, трэба выявіць прычыны рознагалоссяў, ацаніць «унёсак» у іх кожнага ўдзельніка, адключыць эмоцыі і ўключыць розум, пастарацца прыняць кампраміснае рашэнне.

Захаванню добразычлівай атмасферы ў сям'і спрыяюць узаемная павага, імкненне да кампрамісу, талерантнасці, уменне дараваць памылкі свайго спадарожніка, адсутнасць узаемных абвінавачанняў, прамой крытыкі, непрыняцця, здаровая самаіронія партнёраў, захаванне даверлівых адносін, аб'ектыўны погляд на розныя пункты гледжання, уменне захоўваць агульнасць пазіцый і перажыванняў.

**«Прычын для сварак можа быць вельмі шмат, але тое, што іх аб'ядноўвае, — немагчымасць выйсці з канфлікту якім-небудзь іншым, больш канструктыўным чынам».**

Ёсць некалькі дзейсных тактык для рашэння канфліктаў у сямейных адносінах. Такі спосаб, як ухіленне ад канфлікту, можна прымяніць пры няўпэўненасці ў станоўчым вырашэнні спрэчкі. Прыстасаванне магчымае, калі адзін суб'ект дамінуе, а другі прымае яго інтарэсы без вялікіх для сябе страт. Тым самым выпрацоўваецца рашэнне, якое задавальняе абодвух. Супрацоўніцтва спрацуе, калі ёсць жаданне абодвух партнёраў ліквідаваць разлад і прыйсці да ўзаемавыгаднага рашэння пры ўмове раўнапраўя. Кампраміс магчыма дасягнуць, калі абодва бакі ідуць на ўступкі і разумеюць, што хочуць аднаго і таго ж, але ў данай сітуацыі гэта невыканальна. Тады можна прыйсці да нейкага часовага вырашэння праблемы.

Выбар якой-небудзь мадэлі залежыць ад ступені складанасці сітуацыі. Кожная пара ў залежнасці ад сваіх асаблівасцяў зможа знайсці правільны выхад з сітуацыі.

Калі ў мужа і жонкі не атрымліваецца самастойна вырашыць праблему, заўсёды можна звярнуцца да спецыяліста. Псіхатэрапеўт ці псіхолаг зможа стварыць умовы для ўзаемадзеяння бакоў, выяўлення першапрычыны незадаволенасці сабой і іншым і падкажа спосаб устаранення раздражнення і напружання. Сямейны псіхолаг будзе карысны асабліва ў тых сітуацыях, калі размаўляць пасля сваркі адзін з адным не атрымліваецца, калі канфлікты перарастаюць у халодную вайну, з'яўляецца гвалт, уцягваецца ўся сямейная сістэма. Псіхолаг можа дапамагчы ўбачыць тое, што ўтоена за сваркай, знайсці прыдатныя словы, каб наладзіць зносіны, дыялог бакоў, калі ён магчымы. Або прапанаваць работу з кімсьці з членаў сям'і, калі сваркі звязаны па большай частцы з унутранымі цяжкасцямі кагосьці з партнёраў. Калі ў аснове адносін ляжыць каханне, павага і цеплыня адзін да аднога, то дастаткова даць партнёру час астыць і адкрыта пагаварыць, каб выйсці са складанай сітуацыі.

У любым выпадку маркоціцца не варта, бо сваркі здараюцца з усімі, але далёка не заўсёды яны заводзяць сямейную лодку ў тупік.

**Алена КРАВЕЦ.**

# МУЖ «З МІНУЛЫМ»



## Як пабудаваць адносіны з разведзеным мужчынам?

**НАША мінулае неаддзельнае ад нас — менавіта яно робіць нас тымі, кім мы з'яўляемся на дадзены момант. І калі чалавек, з якім вы вырашылі звязаць лёс, перажыў развод і мае дзяцей ад першай жонкі (а тое, што «былых дзяцей не бывае», агульнавядома), — важна разумець, што пасля роспісу ўсё гэта будзе часткай і вашага жыцця. Ці будаваць адносіны з мужчынам, які ўжо знаходзіўся раней у шлюбе? Да чаго трэба быць гатовай? І што дапаможа стварыць гарманічную сям'ю, калі ваш муж — «з мінулым»?**

### ЁСЦЬ ПЫТАННІ...

Калі вам ужо «крыху за трыццаць» (а асабліва калі «далёка за трыццаць») і вы сабраліся замуж, то, хутчэй за ўсё, для вас вышэйпералічаныя пытанні — надзённыя і канкрэтныя, а не абстрактныя і адцягнутыя. І пачнём з добрых навін. Псіхолагі (у прыватнасці вядомы і модны Міхаіл Лабкоўскі) сцвярджаюць, што мужчына, які перажыў развод, — больш падыходны варыянт для выбудоўвання сур'ёзных адносін, чым чалавек, які, перасягнуўшы трыццаціпяцісаракагадовую мяжу, ніводнага разу не быў "галоўным героем" на шлюбнай цырымоніі. У першым выпадку ў наяўнасці арыентаванасць на сям'ю і на сур'ёзныя адносіны, у другім, як кажуць, узнікаюць пытанні...

Статыстыка, на жаль, сведчыць, што сёння каля паловы шлюбаў распадаецца. Але ваш выбраннік калісьці ўсё ж паступіў як прыстойны чалавек: ажаніўся з каханай жанчынай і ўзяў на сябе адказнасць за агульных дзяцей. І гэта гаворыць на яго карысць. Таму што мужчына «з чыстым пашпартам», цалкам верагодна, такой адказнасці на сябе ні разу не прыняў. То-бок цалкам верагодна, што ён па нейкіх прычынах не здольны на партнёрскія адносіны — а прычын тут можа быць мноства, адна адной «лепш»: ад хранічнай інфантыльнасці да хранічнага эгаізму. Можа быць, вядома, і такое, што сваёй адзінай і непаўторнай за многія гады ён проста не сустрэў, бо ўсё жыццё шукаў менавіта вас. Але, пагадзіцеся, калі вам ужо «трохі за трыццаць» (а тым больш калі «далёка за трыццаць»), наўрад ці вы да гэтага часу не выйшлі з узросту, калі верыш у сюжэты бразільскіх серыялаў. Так што разведзены мужчына — варыянт са «знакам якасці». Іншая справа, што для наладжвання гарманічных адносін з такім мужчынам трэба ўлічыць шэраг важных нюансаў. І пачаць варта са збору інфармацыі.

### «СА МНОЙ УСЁ БУДЗЕ ПА-ІНШАМУ»...

Першае і галоўнае пытанне, на якое неабходна ведаць адказ, задумваючыся аб шлюбе з разведзеным мужчынам, — у чым прычына папярэдняга разводу вашага выбранніка, гавораць псіхолагі. Калі аб'ектыўная прычына — п'янства-алкагалізм, здрады, канфліктнасць і гэтак далей, лепш адмовіцца ад прывабнай ідэі «са мной усё будзе па-іншаму». Не будзе! Людзі не мяняюцца, «выхаваць» дарослага чалавека нікому не пад сілу. Не трэба быць экстрасэнсам, каб зразумець, што гісторыя яго папярэдняга няўдалага шлюбу — дакладны прагноз і вашага будучага сямейнага жыцця, а таксама важны сігнал: не паўтарай памылак яго «былой», не наступай на «чужыя граблі».

Калі ж аб'ектыўна «вінаватыя абодва» і наогул усё, што адбылося — «справа жыццёвая», важна ўлічыць наступны аспект, а менавіта: што думае і гаворыць аб сваім папярэднім шлюбе сам мужчына. Якія высновы ён вынес з гэтых адносін і з якімі перакананнямі прыйшоў да шлюбу з вамі? Калі мужчына называе вінаватай у скасаванні шлюбу выключна сваю былую жонку, а сам ён «белы і пухнаты» — гэта нагода сур'ёзна задумацца. «Трывожнымі званочкамі» павінны стаць негатыўныя выказванні пра «былую», падрабязныя расповеды пра іх адносіны ў негатыўным ключы, доўгая, нудная і дробязная дзяльба маёмасці. І асабліва кепскі «сімптом» — імкненне ўхіліцца ад аліментаў, схаваць свае прыбыткі ад «былой», каб плаціць менш, нежаданне ўдзельнічаць у выхаванні і прымаць удзел у лёсе сваіх дзяцей ад першага шлюбу. Калі вы маладая і нявопытная (размова пра шлюб, дзе мужчына значна старэйшы), то, магчыма, вам падасца, што гэты апошні пункт — якраз станоўчы момант, і так вам будзе прасцей і лепш. Аднак падобнае стаўленне мужчына прадэманструе ў будучыні і да вашых агульных дзяцей — ці такога бацьку вы хочаце для іх? Аргумент «са мной усё будзе па-іншаму, бо паміж намі — сапраўднае каханне» пакіньце ўбаку як несур'ёзны. Менавіта так усё і будзе, бо гарачае каханне, якім бы моцным яно ні было, жыве не надта доўга, а потым уступаюць у сілу альбо цеплыня, павага, адказнасць, альбо адхіленасць, халоднасць і эгаізм.

*Што ж гаворыць на карысць вашага выбранніка?*

➢ Перш за ўсё, стаўленне да разводу як да сітуацыі, у якой вінаватыя абодва, бо як выбудоўванне адносін, так і рашэнне іх закончыць — працэс узаемны.

— Калі мужчына вінаваціць у разводзе толькі жанчыну, на жаль, верагодна, ён заўсёды будзе перакладаць адказнасць за любую негатыўную сітуацыю на таго, хто побач — у дадзеным выпадку ўжо на вас, — падкрэслівае **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — Нармальная самаацэнка, усвядомленасць, дарослае стаўленне да жыцця — усё гэта ў тым ліку і пра ўменне прызнаваць сваю віну.

➢ Паважлівыя выказванні аб былой жонцы. І, у ідэале, захаванне добрых, роўных, сяброўскіх адносін з маці сваіх дзяцей. Менавіта так — нават калі вам гэта не падабаецца. У яе жыцці была іншая жанчына, і калі ў сям'і нарадзіліся дзеці, яна застанецца назаўжды. А значыць, будзе яна і ў вашым жыцці.

— Калі ваш мужчына здолеў захаваць з былой жонкай нармальныя цывілізаваныя адносіны, значыць: а) ён будзе паважаць і вас; б) яго «былая» — жанчына разумная і ва ўсіх адносінах адэкватная. Таму існуе высокая верагоднасць, што неўзабаве яна таксама знойдзе сабе мужчыну, і сітуацыя ўраўнаважыцца, — адзначае псіхолаг.

**Не трэба быць экстрасэнсам, каб зразумець, што гісторыя яго папярэдняга няўдалага шлюбу — дакладны прагноз і вашага будучага сямейнага жыцця.**

➢ Імкненне надаваць увагу сваім дзецям. І гаворка не толькі аб матэрыяльнай падтрымцы — гэта наогул не абмяркоўваецца. Але тое, што ваш мужчына імкнецца дарыць сваім дзецям час, увагу і сілы — безумоўна, варта інтэрпрэтаваць толькі ў плюс. Горшае, што можа зрабіць «новая жонка» ў данай сітуацыі, — перашкаджаць зносінам мужчыны з яго дзецьмі ад першага шлюбу.

— Пытанне адносін разведзенага мужчыны да сваіх дзяцей, — мабыць, найважнейшае, калі вы плануеце ў далейшым мець з ім уласных дзяцей, — дадае суразмоўніца. — Калі ён здольны адвярнуцца ад ужо існуючых сына ці дачкі, выкрасліць іх з жыцця, не трэба цешыць сябе ілюзіямі, што ён стане добрым бацькам для вашага агульнага дзіцяці.

### ПАДАРУНАК ЛЁСУ «З ПРЫЧЭПАМ»

Ну, а завяршыўшы збор інфармацыі і яе аналіз, варта спытаць сябе, наколькі камфортна вам мірыцца з тым, што:

➢ Ваш каханы (асабліва пры наяўнасці дзяцей ад першага шлюбу) будзе рэгулярна мець зносіны з былой жонкай, дапамагаць ёй па гаспадарцы. Ці здолееце вы перамагчы ў сэрцы страх, што ён можа да яе вярнуцца?

➢ Ён будзе рэгулярна выконваць бацькоўскія абавязкі ў дачыненні да сваіх дзяцей — і вам так ці інакш давядзецца ў гэтым удзельнічаць. Цалкам абстрагавацца не атрымаецца.

➢ І, нарэшце, частка яго фінансаў будзе сыходзіць у «тую сям'ю».

Калі ўсё гэта здаецца вам непрымальным, шлюб з разведзеным мужчынам — не ваша гісторыя, не варта ў яе нават увязвацца.

А зараз падрабязней пагаворым пра «былую». Вядомы стэрэатып «яго жонка не сцяна, можна і пасунуць» у дадзеным выпадку не працуе. Гэта жанчына будзе заўсёды прысутнічаць у вашым жыцці, ёй будзе патрабавацца дапамога па доме і гаспадарцы ва ўсіх справах — прынамсі, пакуль у яе жыцці не з'явіцца новыя адносіны. І звяртацца яна будзе да свайго былога мужа — проста таму, што за гады сумеснага жыцця прывыкла па ўсіх гэтых пытаннях да яго звяртацца. Паправіць, закруціць, прывезці... І самае неразумнае з вашага боку — істэрыкі і заявы накшталт «або я, або яна!». Менавіта падобныя выказванні падштурхнуць мужчыну да разважанняў на непатрэбныя тэмы: у прыватнасці, аб тым, што «старое каханне не ржавее».

— Ідэальны варыянт — выбудоўванне роўных прыяцельскіх адносін з яго былой жонкай, — кажа Кацярына. — Гэта прадэманструе мужчыну, што вы — дарослая, мудрая жанчына, і ён гэта, безумоўна, ацэніць.

Дарэчы, адзін з распаўсюджаных жаночых страхаў у адносінах з разведзеным мужчынам — тое, што «ён будзе параўноўваць мяне са сваёй былой». Будзе. І яго сябры, і блізкія сваякі (мама і бацька, браты і сёстры) таксама будуць параўноўваць — гэтага не пазбегнуць. Але ў вашых сілах зрабіць так, каб параўнанне было на вашу карысць.

Акрамя таго, вам давядзецца выбудоўваць адносіны з яго дзецьмі ад першага шлюбу — гэтага таксама не пазбегнуць. Псіхолагі, дарэчы, кажуць, што, калі вам здаюцца ну проста невыноснымі і нават агіднымі дзеці вашага выбранніка, — наўрад ці вы на самай справе яго кахаеце. Хутчэй за ўсё, гэта проста закаханасць, якая хутка пройдзе. Калі гаворка пра каханне, вы не можаце не адчуваць прыхільнасці да «працягу» каханага чалавека.

— Выбудоўванне адносін з дзецьмі ад першага шлюбу вашага мужчыны — вельмі важны складнік сямейнай гармоніі, — падкрэслівае псіхолаг. — Вам не трэба імкнуцца замяніць ім маму, канкурыраваць з ёй, але давядзецца стаць ім старэйшым таварышам, нечужым чалавекам. У гэтым выпадку дзеці не атрымаюць траўмы ад разводу вашага мужчыны з іх мамай, бо клапатлівых, значных дарослых у іх жыцці з вашым з'яўленнем не паменшыцца, а дадасца. І вашы адносіны не дадуць расколіну.

### ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ «ДРУГОЙ ЖОНКАЙ»

Дык ці магчымы шчаслівы шлюб з разведзеным мужчынам? Калі ўзаемныя пачуцці моцныя і вы абодва — дарослыя, разумныя людзі з усвядомленым падыходам да адносін, тады, вядома, ваш шлюб будзе гарманічным і моцным. Але, вырашыўшыся адказаць згодай на прапанову рукі і сэрца ад разведзенага мужчыны, неабходна ўбачыць «падводныя камяні» і правесці паміж імі вашу «любоўную лодку». Як гэта зрабіць?

➢ Перш за ўсё, раз і назаўжды абазначце межы.

— «Першая жонка» можа занадта актыўна прысутнічаць у вашым жыцці, патрабаваць увагі былога мужа. І важна адразу ж, яшчэ ў пачатку вашага сямейнага жыцця, дакладна расставіць межы, пагаварыўшы з мужчынам, — падкрэслівае Кацярына. — Менавіта ён павінен знайсці той баланс, які задаволіць абодва бакі: удзяляць дастаткова часу і вам, і «той сям'і».

➢ Выбудоўваючы адносіны з дзецьмі вашага мужчыны, не варта хваляваццa, панікаваць ці злавацца, калі спачатку яны ўспрынялі вас варожа, адзначае псіхолаг. Нават калі іх маці і тата развяліся гады таму, усё роўна існуе верагоднасць, што яны ўспрымуць вас як разлучніцу. Ад вас запатрабуецца ўвесь ваш такт, каб давесці, што вы дзіцяці не вораг, а сябар. Добрыя адносіны з яго дзецьмі — абавязковы складнік вашага сямейнага шчасця, так што давядзецца прыкласці да гэтага і мудрасць, і цярпенне.

➢ І, нарэшце, ёсць некаторая верагоднасць, што мужчына, маючы дзяцей ад першага шлюбу, не будзе спяшацца стаць бацькам у шлюбе з вамі. Бо ў яго ўжо ёсць спадчыннікі, і вам, магчыма, давядзецца пераадолець яго супраціўленне, калі вы цвёрда настроены на ролю мамы.

— Гэта не такая ўжо рэдкая сітуацыя ў практыцы сямейных псіхолагаў, і гэты «падводны камень» — дакладней, яго магчымасць, хоць гэта зусім неабавязкова — таксама важна ўлічваць, уступаючы ў шлюб з разведзеным мужчынам, — адзначае спецыяліст. — Вяртаючыся да пытання аб тым, ці магчымы шчаслівы шлюб з разведзеным мужчынам, адкажу так: вядома, магчымы. Хоць такі шлюб запатрабуе ад вас псіхалагічнай гнуткасці, а часам — нават рашэння нестандартных псіхалагічных «рэбусаў». Але калі вы гатовыя працаваць над адносінамі, валодаеце дастатковым жыццёвым досведам і ўзброіцеся цярпеннем і мудрасцю, узнагародай вам стануць сямейнае шчасце, давер і каханне.

**Дзіяна РОНІНА.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Лидская обувная фабрика»

**Аукцион состоится 31.01.2024 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-52816 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание блока складов), площадью 792,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В.<br>ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423650100007001038 (назначение – для обслуживания здания блока складов) площадью 0,1324 га по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код – 13,4, площадью 0,0078 га.<br>Условия аукциона:<br>- возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки объекта в размере 429 руб.;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца за составление выписки из регистрационной комиссии о правах (ограничениях и обременениях) прав на объект в размере 29,0 руб.;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта |
| **Начальная цена продажи** | 68 112 руб. (шестьдесят восемь тысяч сто двенадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 811 руб. (шесть тысяч восемьсот одиннадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 29.01.2024 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Эконива», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, д. 145, комн. 147д |

**Предмет аукциона**

**Здание производственного цеха**
(здание нежилое),
инв. № 602/С-3436, общ. пл. 251 кв. м,
по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Свислочь.
Составные части и принадлежности: одноэтажное здание производственного цеха с подвалом и гаражом.
***Земельный участок*** с кадастровым номером 624455900001000306, общ. пл. 0,0857 га предоставлен продавцу для содержания и обслуживание зданий и сооружений на праве постоянного пользования.
**Начальная цена, без НДС – 105 300,00 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 5 265,00 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** осмотр осуществляется по предварительному согласованию по тел. +375 29 388-99-50

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: 10** (десять) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов и вознаграждение **4 %** от цены продажи лота возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.09.2023 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **19.02.2024 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **16.02.2024 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АйсЭксперт», Брестская обл., г. Кобрин, пер. Дорожный, 7а |

**Предмет электронных торгов: имущество, расположенное по адресу: г. Кобрин, дорожный переулок, 7а**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (высший сорт) массой 14 200 кг | 230 040,00 |
| **2** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (третий сорт) массой 2473 кг | 28 439,50 |
| **3** | Ягода (малина) замороженная урожая 2023 года (несортовая) массой 2078 кг | 14 899,26 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** (по лотам №№ 2–3) и **4 %** (по лоту № 1), от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.02.2024 г. с 11.00 до 13.00**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.02.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Ограничения и условия в его использовании | Инженерное обеспечение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Боровой 2-й, 13** и земельный участок | 140100000 001023226 | 0,1024 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **136 556,01** (99 128,81 – не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, 37 427,20 – земельный участок) | 27 000,00 | **4 745,14** | 0,0001 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0011 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1024 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | Существует возможность подключения к системам газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом (площадь застройки – 83 кв. м, готовность – 10 %) в г. Бресте, **улица Подлясская, 31** и земельный участок | 140100000 001034084 | 0,1197 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **37 222,76** (8 207,48 – не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, 29 015,28 – земельный участок) | 7 400,00 | **3 584,37** | 0,1197 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения; 0,0035 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки, водоема) | Существует возможность подключения к системам газоснабжения, электроснабжения |

Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с Положением «О порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298, и решением Брестского городского исполнительного комитета от 06.12.2021 г. № 1619

| | |
|---|---|
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением «О порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | **4 000,00 руб.** |
| **Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92 | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 14.02.2024 г.** |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

<u>- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);</u>

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится <u>20 февраля 2024 г.</u> в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.01.2024 г. до 16.00 14.02.2024 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок строгальный четырехсторонний Profimat 23E (WEINIG), инв. № 44502024 | 32100,00 | 3210,00 | 1605,00 |
| 2 | Стреппинг-машина ТР-6000-1, инв. № 4016004 | 5220,00 | 522,00 | 261,00 |
| 3 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW (зав. № FYAF20843, двиг. № 463618), инв. № 50426585 | 35136,00 | 3513,60 | 1756,80 |
| 4 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW33, (2018 г. в.); трехсекц. мачта 3000, вилы 1070 мм, инв. № 41716002; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625025) к инв. 41716002, инв. № 45625025 | 33372,00 | 3337,20 | 1668,60 |
| 5 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW56,2018 г. в., инв. № 41716001; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625026) к инв. 41716001, инв. № 45625026; Система взвешивания и индикации веса для погрузчика, инв. № 47052001 | 48996,00 | 4899,60 | 2449,80 |
| 6 | Автопогрузчик HC CPCD35N-RW13 (стал. каб. с отоп., каретка, мачта V3000), инв. № 50426365; радиостанция автомобильная President Henry ASC 24/12 (Франц.), (45625027) к инв. 50426365, инв. № 45625027 | 30996,00 | 3099,60 | 1549,80 |
| 7 | Форвардер «Valtra 6750», гос. номер АК1 8801, инв. № 50080; полуприцеп лесовозный Palms 13D, 2020 г. в., сер. № 21819, гос. ном. АМ-1 4496, инв. № 50414006 | 80352,00 | 8035,20 | 4017,60 |
| 8 | Щетка дорожная БелДТ-5002 Ф2, инв. № 50426447 | 9432,00 | 943,20 | 471,60 |
| 9 | Платформа транспортная 2ПТТ-918 инв. № 41008 | 2952,00 | 295,20 | 147,60 |
| 10 | Полуприцеп тракторный самосвальный ППЩ28, инв. № 50413004 | 32976,00 | 3297,60 | 1648,80 |
| 11 | Станок для разделки углов в бревнах (инв. № 60100), рольганг (18 м) (инв. № 50426372) | 30960,00 | 3096,00 | 1548,00 |
| 12 | Автопогрузчик HC CPCD35-AW55, рама G5BAK1729, 2021 г. в., инв. № 41716005 | 40392,00 | 4039,20 | 2019,60 |
| 13 | Вилочный автопогрузчик дизельный EP CPCD40 T8, № 528160167, 2019 г. в., инв. № 41717002 | 55656,00 | 5565,60 | 2782,80 |
| 14 | Форвардер «Valtra 6750» гос. номер ОК-5 2581 (инв. № 50073) с гидроманипулятором Paims 5,72 (A4 HS BR2 серийный № 25486) 2020 г. в. (инв. № 41716004) | 100080,00 | 10008,00 | 5004,00 |
| 15 | Привод УМ, Т-80 к трактору, инв. № 70270 | 1800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 16 | Форвардер «Valtra 6750» № 72-60 ОА (50081), гос. номер ОМ-5 8399, инв. № 50081 | 59184,00 | 5918,40 | 2959,20 |
| 17 | Форвардер «Valtra 6750», гос. номер ОВ-5 09-20, инв. № 70210 | 66600,00 | 6660,00 | 3330,00 |
| 18 | Форвардер «Valtra 6750», гос. номер 5019 АВ, инв. № 50074 | 59184,00 | 5918,40 | 2959,20 |
| 19 | Форвардер «Valtra 6750» № 71-70 ОА, гос. номер ОМ-5 8405, инв. № 50079 | 59184,00 | 5918,40 | 2959,20 |
| 20 | Харвестер «Valtra-X120 Forester» 72-63 ОА, гос. номер ОМ-5 8401, инв. № 50084 | 86400,00 | 8640,00 | 4320,00 |
| 21 | Харвестер «Valtra-X120 Forester», гос. номер АМ-1 2174, инв. № 50082 | 86400,00 | 8640,00 | 4320,00 |
| 22 | Харвестр «Valtra x120 F-лайн» (кето 51 + мотомит ИТ) гос. номер ОК-5 0575, инв. № 50426027 | 86400,00 | 8640,00 | 4320,00 |
| 23 | Автомобиль MAZ-631708-364-000P1 с гидроманипулятором «Майман» ММ100-03, гос. номер АС 0964-5, инв. № 50408001; прицеп МАЗ-892620-010 № Y3M892620J0000448, А 3706 Е-5 к АС 0964-5, инв. № 50414001 | 128304,00 | 12830,40 | 6415,20 |
| 24 | Прицеп МАЗ-857102-(010), инв. № 50426267 | 19728,00 | 1972,80 | 986,40 |
| 25 | Автомобиль МАЗ 5440В9, шасси Y3m544B9F0001057, инв. № 50426473; полуприцеп бортовой тентовый KOEGEL SN24P, инв. № 50426501 | 45720,00 | 4572,00 | 2286,00 |
| 26 | Автомобиль-сортиментовоз АСК-18А КАМАЗ (гос. ном. АС 8538-5), инв. № 50426445; прицеп-сорт-воз А0883Е1 Т8302А VIN127 Ф1, инв. № 50426461 | 109296,00 | 10929,60 | 5464,80 |
| 27 | Автомобиль-сортиментовоз КАМАЗ АСК-18А, инв. № 50426428; прицеп-сортиментовоз Т8302А VIN126 гос. номер А 7160 Е-5 Ф3, инв. № 50426462 | 109296,00 | 10929,60 | 5464,80 |
| 28 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*85*3000 – 3,029 м$^3$ / 1 пакет по 396 шт. | 2016,00 | 201,60 | 100,80 |
| 29 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м$^3$ / 1 пакет по 396 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 30 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м$^3$ / 1 пакет по 396 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 31 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*85*3700 – 3,736 м$^3$ / 1 пакет по 396 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 32 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 33 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 34 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 35 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 36 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 37 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3000 – 3,104 м$^3$ / 1 пакет по 363 шт. | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 38 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 39 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 40 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 41 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 42 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 43 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 44 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 45 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 46 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 47 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 48 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 49 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 50 | Доска пола (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %, соединение шип-паз): 30*95*3700 – 3,828 м$^3$/ 1 пакет по 363 шт. | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 51 | Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %) 12*65*3700 – 2,597 м$^3$/ 1 пакет по 900 шт. | 1440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 52 | Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %) 12*65*3700 – 2,597 м$^3$/ 1 пакет по 900 шт. | 1440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 53 | Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %) 12*65*3700 – 2,597 м$^3$/ 1 пакет по 900 шт. | 1440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 54 | Вагонка (сосна, сорт 1-2, влажность 12–16 %) 12*65*3700 – 2,597 м$^3$/ 1 пакет по 900 шт. | 1440,00 | 144,00 | 72,00 |
| 55 | LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*64*13100 – 20,01 м$^3$ | 28872,00 | 2887,20 | 1443,60 |
| 56 | LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*64*13500 – 3,639 м$^3$ | 5256,00 | 525,60 | 262,80 |
| 57 | LVL-брус LVL Ultralam-R: 39*89*13500 – 4,264 м$^3$ | 6120,00 | 612,00 | 306,00 |
| 58 | Станок оцилиндровочный «Практик-2» (экспл. 2014), инв. № 50426347 | 5 640,00 | 564,00 | 282,00 |
| 59 | Радиостанция автомобильная-портативная STABO XH9006E (Герман.) (экспл. 2019), инв. №45625029 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 60 | Радиостанция автомобильная-портативная STABO XH9006E (Герман.) (экспл. 23.08.2019), инв. № 45625031 | 102,00 | 10,20 | 5,10 |
| 61 | RENAULT DUSTER 2018 г. в., гос. номер 77-39 МХ-5 (экспл. 2019) (170796 км), инв. № 50420005 | 23 640,00 | 2 364,00 | 1 182,00 |
| 62 | Автомобиль ЗИЛ-131, 1981 г. в. (экспл. 2012) (17837 км), инв. № 50426064 | 5 640,00 | 564,00 | 282,00 |
| 63 | Автомобиль-сортиментовоз АСК-18А КАМАЗ, 2014 г. в., (экспл. 2015) (236523 км), инв. № 50426422; прицеп-сортиментовоз Т8302В X52T8302BD0000086, 2013 г. в. (экспл. 2013), инв. № 50426262 | 69 120,00 | 6 912,00 | 3 456,00 |
| 64 | Автомобиль-сортиментовоз КАМАЗ АСК-18А, 2015 г. в., (экспл. 2015) (314000 км + 8255 км), инв. № 50426427; прицеп МАЗ-892620-022 № Y3M892620J0000576, 2018 г. (экспл. 2018), инв. № 50414002 | 70 080,00 | 7 008,00 | 3 504,00 |
| 65 | Прицеп 2ПТС-4.5 (экспл. 2010), инв. №70274 | 2 820,00 | 282,00 | 141,00 |
| 66 | Прицеп-сортиментовоз Т8302В X52T8302BD0000087 2013 г. в. (экспл. 2013), инв. № 50426263 | 7 200,00 | 720,00 | 360,00 |
| 67 | Навигатор-видеорегистратор а/м PRESTIGIO PGPS7059CIS04GBPG (экспл. 2018), инв. № 45632013 | 28,80 | 2,88 | 1,44 |
| 68 | Погрузчик фронтальный ТО-18Б, 1999 г. в. (экспл. 2007) (более 5698 м-ч), инв. № 50046 | 16 980,00 | 1 698,00 | 849,00 |
| 69 | Автомобиль LADA 21230 000-А4 с дополнит. оборуд., VIN X9L212300M0733086, г. в. 2021 г. (экспл. 2021) (68482 км), инв. № 50418019 | 27 360,00 | 2 736,00 | 1 368,00 |
| 70 | Автомобиль ГАЗ-66 № 5006-5 АЕ, автобус, 1989 г. в. (экспл. 2008) (25416 км), инв. №70178 | 4 020,00 | 402,00 | 201,00 |
| 71 | Автомобиль груз. фургон ЗИЛ-131 АМ 0267-5, 1988 г. в. (экспл. 2012) (61070 км), инв. № 50426151 | 5 640,00 | 564,00 | 282,00 |
| 72 | МАЗ-631708 комплект 364-000Р1; шасси Y3M631708J0001182с гидроман. 2010Т гос. номер АС 6636-5, 2018 г. в. (экспл. 2018) (205618 км), инв. № 50402002; прицеп МАЗ-892620-010 № Y3M892620K0000670 гос. № А 5358 Е-5 к АС 6636-5, 2019 г. в. (экспл. 2019), инв. № 50414005 | 95 520,00 | 9 552,00 | 4 776,00 |
| 73 | Прицеп СЗАП-8527, 1991 г. (экспл. 2000), инв. № 50035 | 2 820,00 | 282,00 | 141,00 |
| 74 | Прицеп тракторный самосвальный 2ПТС-4,5 2015 г. в. (экспл. 2015), инв. № 50426470 | 4 680,00 | 468,00 | 234,00 |
| 75 | Станок двухпильный Tiger MS550 (экспл. 2017), инв. № 44502001 | 6 060,00 | 606,00 | 303,00 |
| 76 | Автомобиль ГАЗ-66 с кунгом (гос. ном. АС 3872-5 с 2018 г.) 1978 г. в. (экспл. 2003) (99000 км), инв. № 50085 | 3 960,00 | 396,00 | 198,00 |

В отношении лотов №№ 1, 2 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 161 (30041) от 22.08.2023, стр. 6, № 205 (30085) от 21.10.2023, стр. 14, № 232 (300962) от 30.11.2023, стр. 11, № 241 (300971) от 13.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 14. В отношении лотов №№ 3-57 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 205 (30085) от 21.10.2023, стр. 14, № 232 (300962) от 30.11.2023, стр. 11, № 241 (300971) от 13.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 14.
В отношении лотов №№ 58–76 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 178 (30058) от 14.09.2023, стр. 11, № 206 (30086) от 24.10.2023, стр. 6, № 224 (300954) от 18.11.2023, стр. 15, № 239 (300969) от 09.12.2023, стр. 14, № 252 (300982) от 28.12.2023, стр. 10

**Местонахождение лотов №№ 1, 2, 12–27, 55–57, 67–76:** Минская обл., г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40.
**Местонахождение лотов №№ 3–11, 28–54, 58–66:** Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б

**МАЗ-631708 (гос. номер АС 6636-5) имеет обременение в виде залога.
Залог прекращается в случае реализации объекта на торгах (ст. 333 ГК РБ)**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **31 января 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 18 января 2024 года до 16.00 29 января 2024 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 31.01.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 14 (четырнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375292751275, Виноградов Дмитрий Алексеевич (понедельник-пятница с 9.00 по 17.00)** – лоты №№ 1, 2, 12–27, 55–57, 67–76; **+375333031971, Ермошкевич Евгений Васильевич** – лоты №№ 3–11, 28–54, 58–66.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## Информация о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| Номер лота, местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена, рублей |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1: к. п. Нарочь, ул. Садовая, 20** | 0,1314 | 624083390501000095 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)) | 16 000 |
| Дата, время и место проведения аукциона | | **22 февраля 2024 г. в 11.00, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49, зал заседаний, Нарочский сельский исполнительный комитет** | | |
| Извещение опубликовано | Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuyu-sobstvennost-01/) Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search). Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/ru/sformirovan-ru | | | |

УНП 600097530

А вы ведалі?

# ЧЫТАННЕ НА НОЧ



**Кніга — добры настаўнік і сябар. Але сучасныя дзеці звычайна аддаюць перавагу камп'ютарным і мабільным гульням, інтэрнэт-сёрфінгу. Прыцягнуць іх да чытання і пазнаёміць з шэдэўрамі сусветнай літаратуры — справа нялёгкая. Без асабістага прыкладу не абысціся. Але як у жыццёвай мітусні бацькам знайсці на гэта час?.. Пачніце чытаць дзецям на ноч.**

Толькі ўявіце: у пакоі таямнічы паўзмрок, на сценах загадкавыя цені ад начніка ці настольнай лямпы, дзеці ўтульна ўладкаваліся ў ложку і, стрымліваючы дыханне, слухаюць чароўны аповед, што перарываецца толькі шоргатам старонак. Манатонная размеранай ціхай прамовы выдатна закалыхвае, а дзіўныя гісторыі захопліваюць уяўленне, спрыяюць развіццю вобразнага мыслення, фантазіі і творчага пачатку, узбагачаюць унутраны свет і пашыраюць слоўнікавы запас.

## ШТО ЧЫТАЦЬ?

Дзеці, асабліва малыя, гатовы слухаць практычна ўсё, толькі б бацькі былі побач. Таму чытаць можна казкі, апавяданні пра птушыны і жывёльны свет, далёкія краіны, вясёлыя прыгоды і г. д. Толькі мінімізуйце экшн (дзе шмат пагонь, перастрэлак і боек) і страшныя гісторыі.

Дзецям малодшага школьнага ўзросту спадабаюцца кнігі Карнея Чукоўскага, Васіля Віткі, Алана Мілна, Рэдзьярда Кіплінга, Анне-Катарыны Вестлі і іншых. Падлеткам будзе цікава пазнаёміцца з творамі Івана Сяркова, Гектара Мала, Жуля Верна, Джэймса Фенімара Купера і іншых.

Калі ў сям'і некалькі рознаўзроставых дзяцей, кнігі варта чаргаваць: спачатку чытаем дзіцяці твор для малых, а потым для старэйшых. Не хвалюйцеся, што нехта чагосьці не зразумее — добрая літаратура заўсёды мае некалькі сэнсавых узроўняў, якія адкрываюцца ў залежнасці ад «пракачаннасці» ў культуры чытання (асабістага і сацыяльнага вопыту, адукацыі і г. д.). Чым больш ведаў чалавек атрымлівае пра свет, тым глыбей і паўней раскрываецца сэнс твора. Таму адна і тая ж, напрыклад, «Ноч перад Раством» Гогаля ўспрымаецца малымі як чароўная казка, тады як падлеткі бачаць у ёй разважанні аўтара пра сапраўднае каханне.

Чытаць можна нават тое, што дзеці звычайна ўспрымаюць з пэўнымі цяжкасцямі, — доўгія паэмы, аповесці, нарысы, раманы і г. д. Спачатку доўгія «сумныя» ўступы або апісанні прыроды будуць прапускацца між вушэй, але з часам малое ўцягнецца і пачне сачыць за сюжэтам і дзеяннямі персанажаў. А там і да просьбаў абмеркаваць прачытанае, і да «ну яшчэ старонку-дзве, мамачка» — недалёка. А потым дзіця і само возьмецца за кнігу, бо чакаць вечара так доўга, а даведацца, што будзе адбывацца далей, хочацца ўжо зараз. Не паспееце азірнуцца, як кнігі ператворацца ў найлепшых сяброў, а чытанне — у выдатны спосаб правядзення вольнага часу. І ўсё гэта без ціску і крыкаў!

> Чытанне кніжак супакойвае маленькіх дзяцей. Бацькоўскі голас у спалучэнні з добрай гісторыяй дапамагаюць забыцца пра капрызы і крыўды, якія накапіліся за дзень, і спрыяюць прыходу светлых сноў. Адзіная ўмова — аповеды павінны мець пазітыўнае заканчэнне, дзе дабро перамагае зло. Інакш можна атрымаць адваротны эфект — начныя кашмары і разбіты стан уранку. Дарэчы, гэтая парада падыходзіць і дарослым. Каб жыццё не падавалася цёмным і змрочным, лепш не чытайце перад сном стужку навін і жудасныя гісторыі.

> Калі перапыніць чытанне на самым цікавым месцы, дзеці будуць з нецярпеннем чакаць наступнага вечара і з большай ахвотай будуць класціся спаць.

## ПАПЯРОВАЯ КНІГА ЦІ АЎДЫЯ?

Часам бацькі замест таго, каб самім узяцца за кнігу, уключаюць аўдыязапісы. Здаецца, розніца невялікая, так нават прасцей: і дзеці заняты праслухоўваннем, і мама з татам могуць спакойна сваімі справамі займацца. Але псіхолагі ўсё ж раяць не карыстацца дапамогай электроннага чытальніка без асаблівай на тое патрэбы. Чаму? Аўдыякніжкі незаменныя ў паездках, на дачы, пры з'яўленні сапраўды неадкладных спраў. Але ёсць недахопы і ў іх:

Малым патрэбны менавіта бацькі (мама ці тата, на крайні выпадак — бабуля-дзядуля), іх голас і прысутнасць. Пакуль падлеткі будуць прагна сачыць за сюжэтам, дзеці дашкольнага ўзросту абавязкова збегуць з ложка і адправяцца на пошукі бацькоў.

> Дзецям, у першую чаргу маленькім, важны тактыльны кантакт, таму адначасова з чытаннем можна пагладзіць іх па спінцы ці ручцы, прыабняць, прылегчы побач або пасадзіць на калені, асабліва калі кніга з цікавымі малюнкамі. Пакуль вы будзеце чытаць, яно з задавальненнем разглядзіць ілюстрацыі, што, дарэчы, палепшыць успрыманне інфармацыі.

Змест кнігі можа выклікаць пытанні. Напрыклад, могуць сустрэцца невядомыя словы ці выразы або дзіця не зразумее ўчынкі персанажаў, сюжэтныя павароты. Нарэшце, добры твор заўсёды насычаны літаратурнымі, гістарычнымі і культурнымі адсылкамі. Але электронны чытальнік не здольны зрабіць паўзу для тлумачэння складаных момантаў, алюзій і метафар, раскрыць павodзіны герояў, напрыклад, з маральна-этычнага пункту гледжання, правільна расставіць акцэнты.

Аўдыякніжкі дазваляюць проста пазнаёміцца з творам, тады як бацькоўскае чытанне ўслых — частка выхаваўчага працэсу. Добрая магчымасць неўпрыкмет правесці аналогіі з хвалюючымі дзіця падзеямі і праблемамі, своечасова і да месца ўзняць і абмеркаваць важныя тэмы: адносіны паміж людзьмі, шкодныя звычкі, вечныя каштоўнасці і г. д.

Чытанне перад сном — традыцыя выдатная. Там, дзе бацькі яе прытрымліваюцца, дзеці больш паслухмяныя, чуллівыя да навакольнага свету і творчыя. А яшчэ яна замацоўвае ўзаемасувязі між бацькамі і малымі і гарантавана прывівае любоў да кніг.

**Александрына ПАРШЫНА**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## САЛАТА «РАФАЭЛА»



***Спатрэбіцца:*** *філе курынае — 300 г, грыбы — 300 г, яйкі — 4 шт., сыр — 150 г, морква па-карэйску — 150, цыбуля — 1 шт., алей для смажання, зяленіва для ўпрыгожвання.*

Філе заліваюць кіпенем, зноў даводзяць да бурлення і адключаюць, само дойдзе пад вечкам. Рэзаць яго не трэба, парвіце рукамі.

Здрабніце грыбочкі, затым цыбуліну, і — на патэльню з алеем. Смажым.

У вараных яек акуратна аддзяляем жаўткі ад бялкоў. Здрабніць жаўткі, асобна нарэзаць на чацвярцінкі бялкі. Сыр дробна надзерці.

Збіраем салату пластамі: курынае філе і маянэз, грыбы, смажаныя з цыбуляй, і маянэз, морква, верхні пласт — жаўткі і маянэз.

Раскласці кавалачкі варанага бялка па перыметры талеркі. Сярэдзіну пасыпаць надзёртым сырам і нарэзаным зяленівам.

## ГРУЗІНСКІ СУП



***Спатрэбіцца:*** *чырвоная кансерваваная (ці проста вараная) фасоля — 800 г, цыбуля рэпчатая — 200 г, бульба — 350 г, часнок — 4 зубкі, масла — 30 г, алей і тАматная паста — па 2 ст. л, вада — 800 мл., кінза свежая — 15 г, хмелі-сунелі — 1 ч. л., шматкі чырвонага перцу чылі — — 1 ч. л., чорны мелены перац — 0,5 ч. л., соль — 1-2 ч. л.*

Разаграваем у рондалі з тоўстымі сценкамі алей і дадаём да яго масла, абсмажваем дробна нарэзаную цыбулю да празрыстасці.

Затым дадаём у рондаль нарэзаную кубікамі бульбу і ўліваем ваду. Змешваем, даводзім да кіпення і пад вечкам варым 15 хвілін на слабым агні. Затым дадаём чырвоную фасолю разам з сокам.

Туды ж кладзём таматную пасту, высыпаем шматкі чылі, чорны перац, хмелі-сунелі. Змешваем, даводзім да кіпення і варым усё 10 хвілін на слабым агні. Апошняя рыска: пасыпаем суп здробненай кінзой і часнаком, частку супу пюрыруем, змешваем з другой часткай і можна раздаваць па талерках.

Падавайце абавязкова гарачым і са свежым хлебам.

## БУЛЬБАЧКА «ПАЛЬЧЫКІ АБЛІЖАШ»



***Спатрэбіцца:*** *бульба — 10 шт. сярэдняга памеру; часнок — 3 зубкі; масла — 100 г; смятана 15 % тлустасці — 3 ст. л; цвёрды сыр — 100 г; соль на смак і на кончыку нажа мускатны арэх.*

Абіраем бульбу і наразаем буйна. Выкладаем яе ў форму для запякання.

Асобна трэба змяшаць здробнены часнок, смятану, сыр надзёрты, масла. Пасаліць і дадаць мускатны арэх. Ён надасць бульбе прыемны смак.

Атрыманую падліўку выліваем на бульбу. Добра змешваем. Лепш накрыць форму фольгай. Выпякаем пры 180 °С каля гадзіны да мяккасці. Залежыць ад таго, наколькі буйна вы парэзалі бульбу.

Можна дадаткова гатовую бульбу пасыпаць сырам. Есці яе лепш адразу, пакуль не астыла.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

## НАДАКУЧЛІВАЯ ХАРЧОВАЯ МОЛЬ

***Ад з'яўлення харчовай молі на кухні, на жаль, ніхто не застрахаваны. Аднак добрая навіна заключаецца ў тым, што ёй неабавязкова станавіцца вашым пастаянным «арандатарам».***

Гэтыя насякомыя могуць з'явіцца, калі доўга захоўваць крупы адкрытымі. Але могуць распаўсюдзіцца і ў выпадку, калі вы прынеслі з крамы прадукт, у якім ужо пасяліліся лічынкі.



Харчовая моль — сама назва ўжо гаворыць пра тое, дзе яе шукаць, аднак важна ведаць, што пасля з'яўлення яна імкнецца зрабіць сабе дом у якіх-небудзь шчылінах, напрыклад, у кутах кухонных шафаў.

***Пачніце з пошукаў ачага***

Каб вынік барацьбы быў дзейсным, неабходна пачаць з пошуку гнязда лічынак. Праверце ўсе цёмныя месцы і куткі на кухні: ліштва, унутраныя куты шафаў, хлебніцы і таму падобнае. Калі такое месца выяўлена, неабходна ад яго пазбавіцца. Пыласос стане добрым памагатым. Можна абысціся шчоткай і мяшком для смецця, але тут важна сачыць за тым, каб смецце было вынесена своечасова і шкоднікі не паспелі зноў выбрацца вонкі.

Затым надыходзіць другі этап — рэвізія прадуктаў. Хоць харчовую моль яшчэ называюць мучной і збожжавай, назва крыху ўводзіць у зман, бо гэты паразіт можа жыць не толькі ў крупах, але практычна і ў любым сухім харчовым прадукце, нават у гарбаце і сухіх сняданках. Калі дзесьці заўважылі штосьці падобнае на тонкую нітку ці павуціне, то можаце быць на 100 % упэўненыя, што менавіта там знаходзяцца лічынкі, якія праз час ператворацца ў назойлівых лятучых насякомых.

***Народныя метады***

Пасля знішчэння асноўных ачагоў і ўтылізацыі пашкоджаных насякомымі прадуктаў можна распачаць прафілактычныя меры, каб гісторыя не паўтарылася.



Кухонныя шафы і месцы, дзе вы выявілі ачагі, варта вымыць. Ніякія спецыяльныя інструменты не патрэбны. Самая звычайная мыльная вада вельмі эфектыўная. Толькі перад гэтым пераканайцеся, што ні ў адной шчыліне сапраўды не засталося паразітаў, бо ў адваротным выпадку яны нават пасля мыцця могуць хутка вярнуцца ў вялікай колькасці.

Калі пад рукой няма мыла, дапаможа і моцны воцатны раствор. Тут улічыце, што прапорцыі павінны быць прыкладна 1:1, а пасля мыцця шаф памяшканне неабходна праветрыць.

***Каб насякомыя не вярнуліся:***

1. Захоўвайце ўсе сухія прадукты ў шчыльных герметычных кантэйнерах, напрыклад, у шкляных ці цвёрдых пластыкавых.
2. Не стварайце вялікія запасы, якія будуць захоўвацца месяцамі, калі не можаце забяспечыць іх захоўванне ў кантэйнерах, згаданых вышэй.
3. Харчовая моль не любіць пах лаванды, лаўровага ліста, тытуню. Вы можаце паставіць гэтыя травы побач і ў кухонных шафах.

НЕ ВЫБІРАЙ ДЗЕЎКУ Ў КАРАГОДЗЕ, А ШУКАЙ У АГАРОДЗЕ (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).

# А вы адказны падаткаплацельшчык?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падатковую дэкларацыю абавязаны прадставіць тыя асобы, якія мелі ў 2023 годзе даходы: ад продажу маёмасці, у выніку дарэння, атрыманыя з-за мяжы або за мяжой, асобныя даходы, на якія чалавеку быў вызначаны сацыяльны падатковы вылік.

## ПРАДАДЗЕНЫЯ МАШЫНЫ, КВАТЭРЫ І ДАМЫ

Самая вялікая катэгорыя тых, хто павінен падаць дэкларацыю, — тыя асобы, якія атрымалі даходы ад продажу нерухомай маёмасці і транспартных сродкаў. Але тут ёсць асаблівасці. Калі на працягу года прададзены два і больш легкавыя аўтамабілі, то з другой і наступных прададзеных аўтамашын трэба аплачваць падаходны падатак па выніках года. Калі прададзены грузавы аўтамабіль масай звыш 3,5 тоны або аўтобус з больш чым васьмю пасадачнымі месцамі, то нават адна адзінка гэтай рухомай маёмасці абкладаецца падаткам.

Што датычыцца нерухомасці, тут гаворка ўжо ідзе не аб адным, а аб пяці гадах. Калі на працягу пяці апошніх гадоў прададзены дзве кватэры, два жылыя дамы, два зямельныя ўчасткі, — даходы ад другога аб'екта продажу абкладаюцца падаткам. Але гэта датычыцца дзвюх аднатыпных адзінак маёмасці, напрыклад кватэр. А калі прададзеныя кватэра і жылы дом, то ні тое, ні другое падаткам не абкладаецца.

Варта адзначыць адзін важны момант пры продажы нерухомасці. Ільгота па адным адчужэнні прадастаўляецца толькі ў дачыненні да кватэр, жылых дамоў, садовых домікаў (дач), зямельных участкаў, гаражоў і машына-месцаў. Калі прадаецца любая іншая нерухомасць, напрыклад, камерцыйная (офісы, гандлёвыя будынкі), то нават аднаразовы продаж абкладаецца падаткам.

Тут існуе выключэнне з правілаў. Прадавець у кароткі тэрмін можна любую колькасць дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба, незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

## ДАРАГІЯ ПАДАРУНКІ ЛЕПШ ПАДЛІЧЫЦЬ

Што рабіць з тымі даходамі, якія ў мінулым годзе вы атрымлівалі ў выніку дарэння ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна ад фізічных асоб? Правільна, іх трэба ўлічваць.

Падарункі ад асоб, якія не адносяцца да блізкіх родзічаў, ад сяброў, напрыклад, абкладаюцца падаходным падаткам. Але ёсць падатковая льгота: сума да 9338 рублёў, атрыманая летась, падаткам не абкладаецца.

Выключэнне складаюць даходы, атрыманыя ад блізкіх родзічаў і асоб, якія знаходзяцца з падаткаплацельшчыкам у стасунках сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага. Такія даходы не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання незалежна ад атрыманай сумы.

Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, адносяцца бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку усыноўленыя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, прадзед, прабабка, праўнукі, муж і жонка. Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах сваяцтва, належаць блізкія родзічы сужэнца, уключаючы таго, хто памёр, абвешчаны памерлым.

## ГРОШЫ, АТРЫМАНЫЯ З-ЗА МЯЖЫ АБО ЗА МЯЖОЙ

Дэкларацыю падаюць работнікі, прызнаныя ў 2023 годзе падатковымі рэзідэнтамі нашай краіны і якія атрымалі даходы з-за мяжы або за мяжой.

Рэзідэнты — гэта тыя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі ў каляндарным годзе больш за 183 дні. Да часу фактычнага знаходжання на тэрыторыі краіны адносіцца час непасрэднага знаходжання чалавека ў краіне, а таксама час, на які ён выязджаў за межы краіны: на лячэнне, у камандзіроўку ў адпаведнасці з заканадаўствам, на адпачынак, — пры ўмове, што час знаходжання на такім адпачынку ў сукупнасці па ўсіх выездах за межы краіны на працягу каляндарнага года складае не больш за 60 каляндарных дзён.

Прыкладам даходаў, атрыманых з-за мяжы або за мяжой, могуць быць наступныя даходы: ад працы па найму (кантракце); ад продажу акцый або іншых каштоўных папер; ад продажу долі ў статутных фондах замежных арганізацый; у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках; атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і іншыя.

Асноўная маса даходаў з-за мяжы — гэта заработная плата, дывідэнды, працэнты па рахунках і ўкладах у замежных банках, выйгрышы ў замежных анлайн-казіно і на рынку «Форэкс». Дык вось, фактычна выплачаная сума падатку ў замежнай дзяржаве падлягае заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку. Тут галоўнае — падаць неабходныя дакументы. Гэты дакумент павінен быць завераны падатковай службай замежнай дзяржавы.

Вялікі пласт займаюць і грашовыя пераводы ад іншых грамадзян. Калі гэта блізкія родзічы (бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры, дзядулі і бабулі, унукі), то падаходным падаткам гэтыя даходы не абкладаюцца незалежна ад іх памеру і падаваць падатковую дэкларацыю не патрабуецца. Тое ж адносіцца і да блізкіх сваякоў сужэнца. Калі мама вашай жонкі вам нешта падорыць з-за мяжы, вы падатак з гэтай сумы плаціць не будзеце.

## БУДАЎНІЦТВА СПЫНЕНА, А ВАМ ДАВАЛІ САЦЫЯЛЬНЫ ПАДАТКОВЫ ВЫЛІК

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патанення такога будаўніцтва альбо выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацыі забудоўшчыкаў.

Спецыялісты Міністэрства па падатках і зборах адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, абкладаюцца падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней была прадастаўлена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэклараваць таксама і даходы, якія былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры датэрміновым пагашэнні жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя падаецца ў тым выпадку, калі па ўнесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў праведзены маёмасны падатковы вылік.

Такі ж механізм прадугледжаны, калі адмяняецца вылік на даходы ў выглядзе лізінгавых плацяжоў, якія аплачаны па дагаворы фінансавай арэнды, што прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу — аднакватэрнага жылога дома або кватэры, у выпадках, калі такі дагавор не завяршыўся выкупам маёмасці або ў дагавор былі ўнесены змены, якія выключаюць ўмовы выкупу прадмета лізінгу.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў у мінулым годзе такія грашовыя сродкі, абавязаны заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была выдзелена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

## СПАРТСМЕНЫ, ЛІТАРАТАРЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Сярод нас ёсць і тыя, хто можа падаць у інспекцыю дэкларацыю з мэтай атрымання падатковых вылікаў. У прыватнасці, гэта датычыцца людзей, якія атрымлівалі ў мінулым годзе аўтарскія ўзнагароджанні або ўзнагароджанні за стварэнне, выкананне ці іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, выплаты аўтарам вынаходак, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці.

Дэкларацыю варта запоўніць таксама спартсменам і іх трэнерам, якія атрымлівалі даходы ад асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўлялася імі не ў рамках каманднага ўдзелу.

## ВЯРТАЕМ ПЕРАПЛАЧАНЫ ПАДАТАК

Для гэтага спачатку трэба падаць у інспекцыю падатковую дэкларацыю за мінулы год і вывісць у ёй звесткі аб атрыманых даходах. Да дэкларацыі абавязкова павінна быць прыкладзеная даведка ад падатковага агента аб налічаным даходзе і ўтрыманым падатку па ўстаноўленай форме. Далей трэба ўказаць у падатковай дэкларацыі звесткі аб праве фізічнай асобы на атрыманне пэўных падатковых ільгот.

Да дэкларацыі абавязкова павінны быць прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць права фізічнай асобы на атрыманне падатковых ільгот. Пасля таго як падатковы орган зробіць пераразлік падаходнага падатку і разлічыць суму падатку да вяртання, трэба напісаць заяву на вяртанне падатку па пэўнай форме.

Вяртанне падатку ажыццяўляецца двума спосабамі: на рахунак, адкрыты ў банку, уключаючы карт-рахунак; наяўнымі грашовымі сродкамі з касы банка, у якім абслугоўваецца падатковы орган.

Калі фізічная асоба жадае вярнуць падатак на свой банкаўскі рахунак, то ў заяве на вяртанне падатку неабходна ўказаць рэквізіты банкаўскага рахунку: нумар і тып рахунку, найменне банка, код банка, код валюты. На працягу 15 рабочых дзён з моманту падачы заявы на вяртанне падатку трэба атрымаць грошы.



І яшчэ. Для плацельшчыкаў, якія падаюць падатковую дэкларацыю выключна з мэтай атрымання падатковых вылікаў па падаходным падатку, тэрмін яе прадстаўлення не абмежаваны 31 сакавіка. Дата атрымання выліку можа быць адвольнай.

## ЛЕПШ — ПРАЗ АСАБІСТЫ КАБІНЕТ ПЛАЦЕЛЬШЧЫКА

Ёсць тры асноўныя спосабы падачы падатковай дэкларацыі: асабіста шляхам наведвання падатковага органа, па пошце і ў электронным выглядзе. У першым выпадку фізічная асоба запаўняе дэкларацыю і з пашпартам звяртаецца ў падатковы орган. У нас дзейнічае прынцып экстэрытарыяльнасці абслугоўвання. Гэта значыць чалавек звяртаецца ў любую інспекцыю незалежна ад таго, дзе ён пражывае, дзе зарэгістраваны, дзе знаходзіцца на падатковым уліку. Напрыклад, калі вы прапісаныя ў Ляхавічах, але жывяце і працуеце ў Мінску, можаце спакойна звярнуцца ў любую падатковую, як вам будзе зручна. Там усё зробяць, паведамленне на выплату вы атрымаеце.

Другі спосаб — падача дэкларацыі праз паштовую сувязь. З любой даведачнай сістэмы альбо з афіцыйнага сайта падатковых органаў можна загрузіць бланк дэкларацыі, запоўніць яго ўручную або на камп'ютары, раздрукаваць, падпісацца і накіраваць па пошце. У гэтым выпадку дата падачы дэкларацыі — дзень паштовага адпраўлення. Калі хтосьці не паспявае звярнуцца ў падатковы орган, ён можа 31 сакавіка адправіць дэкларацыю. Хоць яна прыйдзе ўжо ў красавіку, чалавек тэрмін не парушыць.

Самы перспектыўны на сённяшні спосаб — падача ў электронным выглядзе. Тут ёсць важная асаблівасць. Чалавеку неабходна аднаразова звярнуцца ў любы падатковы орган з пашпартам, каб зарэгістравацца ў асабістым кабінеце плацельшчыка, атрымаць уліковы запіс і пароль. Вялікая перавага ў тым, што дэкларацыю ў электронным выглядзе можна падаць з любога пункту свету, не трэба нікуды ездзіць. Другі вельмі важны плюс у тым, што такім плацельшчыкам бліжэй да канца студзеня ўжо прадстаўляецца папярэдне запоўненая форма дэкларацыі. Пры неабходнасці яе трэба толькі падправіць.

## ПАРУШАЛЬНІКАМ НА ЗАМЕТКУ

Калі кліент падатковай «забыўся» падаць дэкларацыю, па якой ён павінен аплаціць падаткі і пратэрмінoўка склала больш за 30 рабочых дзён, яму выставяць штраф у памеры 0,5 базавай велічыні з павелічэннем яго на 0,5 БВ за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але не больш за 10 базавых велічынь.

А калі чалавек спазніўся з выплатай падаходнага падатку — у такім выпадку, калі нявыплачаная або не цалкам выплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню (40 рублёў), гэта цягне накладанне штрафу ў памеры 15 % ад нявыплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 (20 рублёў) базавай велічыні.

## ДЛЯ СУПЕРБАГАТЫХ — 25 % ПА ВЫНІКАХ ГЭТАГА ГОДА, А ЗАПЛАЦЯЦЬ — У 2025-М

**Стаўка падаходнага падатку ў дачыненні да часткі даходаў звыш 200 тысяч рублёў за каляндарны год складзе 25 %.** Павышаная стаўка будзе прымяняцца ў дачыненні да сукупнасці даходаў (па працоўных дагаворах, грамадзянска-прававых дагаворах, у выглядзе дывідэндаў), якія перавысілі за падатковы перыяд 200 тысяч рублёў. Лічыцца, што павышанае падаткаабкладанне можа закрануць каля дзвюх тысяч чалавек.

Пры гэтым варта адзначыць, што пад павышанае падаткаабкладанне не трапляюць даходы, якія абкладаюцца па паніжаных стаўках падаходнага падатку і, у прыватнасці, даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі па працоўных дагаворах ад рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій, Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», суб'ектаў інавацыйнай дзейнасці гэтага індустрыяльнага парка, сумеснай беларуска-кітайскай кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка.

Акрамя таго, стаўка падаходнага падатку 25 % не будзе распаўсюджвацца на дывідэнды, якія абкладаюцца па льготных стаўках у выпадках неразмеркавання прыбытку на працягу трох (стаўка 6 %) або пяці (0 %) гадоў, што будзе з'яўляцца дадатковым стымулам накіроўваць чысты прыбытак на рэінвеставанне на працягу 3—5 гадоў.

## А ЯК У ІХ?

Напрыклад, у Германіі дзейнічае прагрэсіўная шкала і нават ёсць мінімальны памер даходу, з якога падатак наогул не ўтрымліваюць, — 9,75 тысячы еўра ў год. Далей стаўка расце ад 14 % да 42 %, апошні бяруць з зарплаты ў 58 тысяч еўра ў год і вышэй. Самы вялікі падатак — 45 % — у людзей з прыбыткам вышэй 274,6 тысячы еўра ў год.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки

- ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
- ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов**

**Магазин № 16 – 82,6 кв. м** (инв. № 640/С-26620, составные части и принадлежности: холодная пристройка, склад). Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, Серяжский с/с, д. Варковичи, ул. Братьев Басалыга, 94Б.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0214** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 11.04.2038) для обслуживания здания магазина № 16

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 7 680,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** оплата (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение **5 (пяти) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 8 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.12.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.01.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.01.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные:**
**+375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «СанБридж», г. Минск, ул. Мясникова, 32, помещение 2, каб. 30 |

**Предмет электронных торгов: оборудование. Местонахождение: г. Минск, тр-т Старовиленский, 3**

| № лота | Наименование (марка, модель) | Начальная цена продажи лота, руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Кухонное оборудование (эл. индукционные плиты, фритюрница, макароноварка, духовой шкаф, столешница и т. д.) в количестве 19. Перечень размещен на ЭТП www.ipmtorgi.by в разделе «Документы» | 119 925,00 |
| 2-3 | Электрическая плита со сплошной поверхностью Ambach EP/90; электрический духовой шкаф Ambach UBE/90 | 13 635,00 |
| 4 | Электрический гриль и др. оборудование. Перечень размещен на ЭТП www.ipmtorgi.by в разделе «Документы» | 14 445,00 |
| 5-8 | Столешница из нерж. стали Ambach AT/45; нейтральная подставка под основное оборудование, с открытым шкафом, нержавейка Ambach UBO/45 GN | 2 979,00 |
| 9 | Столешница из нерж стали Ambach A-AT/45; нейтральная подставка под основное оборудование, с открытым шкафом, нержавейка Ambach UBO/45 GN | 3 159,00 |
| 10 | Столешница из нерж. стали Ambach AT/90-M; нейтральная подставка под основное оборудование, с открытым шкафом, нержавейка Ambach UBO/90 GN | 3 510,00 |
| 11 | Электрический пищевой котел Ambach EBD/140E III-AW; панели нерж. стали для обшивки кухонного модуля Ambach | 37 395,00 |
| 12 | Электрическая индукционная плита 2 конфорки Ambach 8IHR2UBO/50; столешница и встраиваемая тумба из нерж. стали Ambach | 17 595,00 |
| 13 | Электрическая фритюрница с двумя резервуарами Ambach EF2/45EPL | 16 470,00 |
| 14 -15 | Электрическая индукционная плита Ambach IHE2/45II | 12 735,00 |
| 16 | Центральная стойка из нержавейки для подвешивания инвентаря Ambach | 6 390,00 |
| 17 | Электрическая опрокидываемая сковородка Ambach 9EKB/120 | 18 900,00 |
| 18 | Электрическая плита со сплошной поверхностью Ambach 8EPUBO/80 | 8 100,00 |
| 19 | Миксер на 60 л с чашей и тележкой для чаши BONGARD Saturne 3 | 25 920,00 |
| 20 | Тестораскаточная машина в длину, с 3 комплектами вращающихся ножей BONGARD SF600LLT | 24 840,00 |
| 21 | Тестокруглитель и тестоделитель для булочек 30 делений BONGARD DB 30/3 | 22 320,00 |
| 22 | Охладитель воды, хладоген R404A BONGARD L120 | 10 800,00 |
| 23 | Дозатор-смеситель воды BONGARD DOMIX 30 | 7 650,00 |
| 24 | Модульная 4-ярусная электропечь с парогенератором BONGARD M4 SOLEO. В комплекте: декоративная вытяжка и ручной погрузчик | 52 110,00 |
| 25 | Хлебобулочная конвекционная печь (духовка) BONGARD Krystal 46.9V | 19 170,00 |
| 26 | Шкаф расстоечный холодильный кондитерский BONGARD BFA, вид 1C1P, размер 600 на 800, хладоген R404A | 15 300,00 |
| 27 | Пастеризатор яиц Leda Technologies Pollux 60 | 11 880,00 |
| 28-29 | Электропечь конвекционная с парогенератором Combi Master Plus RATIONAL CMP201 | 24 210,00 |
| 30-31 | Пароконвектомат RATIONAL CMP 61 | 9 450,00 |
| 32 | Подставка UG 2 для пароконвектоматов RATIONAL (CMP61/101) | 1 530,00 |
| 33-35 | Электропечь конвекционная с парогенератором Combi Master Plus, RATIONAL CMP101 | 13 920,00 |
| 36-42 | Смеситель с нагревом воды QUOOKER PRO7-VAQ | 2 314,29 |
| 43-44 | Стирально-отжимная машина Unimac UX35 | 16 335,00 |
| 45-47 | Стирально-отжимная машина Unimac UX100 | 44 100,00 |
| 48-49 | Барабанные сушилки Unimac UU120 | 24 030,00 |
| 50 | Барабанные сушилки Unimac UU055 | 10 800,00 |
| 51 | Гладильные машины с нагреваемым валом – каландры Unimac FCU 1664/320 | 18 270,00 |
| 52 | Гладильные машины с нагреваемым валом – каландры Unimac FCU 3200/500 | 99 900,00 |
| 53-54 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 2100/1000/500 мм | 1 980,00 |
| 55 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 1650/1100/500 мм | 3 510,00 |
| 56 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 2600/1000/500 мм | 6 480,00 |
| 57 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen, мод. V-ADV. Размер 2600/2400/1200/1000/600 мм | 7 920,00 |
| 58 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-UV. Размер 2600/1400/500 мм | 49 320,00 |
| 59-60 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream D-90-UV. Размер 6300/2600/500 мм | 73 800,00 |
| 61 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-90-UV. Размер 1300/1500/600 мм | 30 600,00 |
| 62 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-90-UV. Размер 1300/1300/600 мм | 26 910,00 |
| 63 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-90-WW Mistry. Размер 2450/1400/650 мм | 46 440,00 |
| 64 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream E-90-UV. Размер 2400/1300/650 мм | 53 100,00 |
| 65 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-90. Размер 2000/1400/500 мм | 28 890,00 |
| 66 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream A-90. Размер 4000/1900/500 мм | 32 400,00 |
| 67 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 3700/1400/500 мм | 3 330,00 |
| 68 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 990/990/500 мм | 2 790,00 |
| 69 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 2350/1100/500 мм | 3 780,00 |
| 70 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-Jet Stream E-90-UV. Размер 3400/2400/600 мм | 116 100,00 |
| 71 | Кухонная вытяжка-фильтр Vianen V-ADV. Размер 990/990/500 мм | 2 520,00 |
| 72 | Котел паровой Loos-Universal и др. оборудование. Перечень размещен на ЭТП www.ipmtorgi.by в разделе «Документы» | 259 740,00 |
| 73-115 | Ковровое покрытие тканно, тип Wilton для апартаментов тип King, Alarwool ME-227-C, рулон 77,8 кв. м, размер 19.45*4 | 3 849,70 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120 04835008022600 0 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 4 до 10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия. Извещение о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2023 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.02.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.02.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ (АУКЦИОНЕ)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 30.11.2023 в газете «Звязда» № 232 (300962), стр. 14**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Помещение 3-го и 4-го этажей, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/4-2 | 672 840,00 | 448 560,00 |
| 2 | Помещение кладовой, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/4-5 | 4 536,00 | 3 024,00 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 27.12.2023 в газете «Звязда» № 251 (300981), стр. 12**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, без НДС рос. руб. | Минимальная цена, без НДС рос. руб. |
|---|---|---|---|
| 3 | Наименование дебитора: акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва. Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт./пом./ком./оф. 1/VII/АЗД, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012, ИНН: 7714887246, КПП: 771401001) | 176 100,00 | 158 490,00 |

**Десятые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 27.12.2023 в газете «Звязда» № 251 (300981), стр. 12**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 4 | Хозяйственно-складской участок № 76, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102 | 9 792,00 | 4 896,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by, и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота, в случае если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 1 % от цены продажи лота в случае если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей, 4 % от цены продажи лота по лоту № 3 в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):**
01.02.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов.
Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 31.01.2024 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**

## «БелЮрОбеспечение» (192821149)

**назначено проведение электронных торгов**

| | |
|---|---|
| Организатор | Общество с ограниченной ответственностью «Лайнберг-Групп» |
| Предмет | Лот № 9.2024.02.00008 мини-экскаватор Komatsu PC15R8, 2005 |
| Место нахождения | Гродненская область, г. Лида, пр. Победы, 168 В |
| Начальная стоимость | 34 500,00 бел. руб. с НДС |

**Торги будут проведены 08.02.2024 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 07.02.2024.

Подробная информация размещена на сайте **e-auction.by** в разделе «Аукционы».

УНП 192821149

# За дзвюма гіенамі

## Што адбываецца ў Польшчы?

**Польскі Сойм пачаў свае паседжанні пасля таго, як на мінулым тыдні работа ніжняй палаты парламента была адкладзеная з-за глыбокага канстытуцыйнага крызісу. Як адзначыў агенцтву PAP маршал (спікер) Сейма Шымон Халаўня, орган знаходзіцца «ў стане глыбокага расколу», паведаміла ТАСС. «Мы знаходзімся ў стане вострай спрэчкі», — прыводзіць словы маршала інтэрнэт-партал onet.pl. «Я чакаю вострых пасяджэнняў Сейма, але бойкі не чакаю», — заўважыў Халаўня, дадаўшы, што ён гатовы «да ўсіх варыянтаў». Ён паведаміў, што дэпутаты будуць абмяркоўваць бюджэт, пытанні вышэйшай адукацыі і навукі, а таксама шпіёнскую праграму Pegasus, з дапамогай якой маглі праслухоўвацца тэлефоны шэрагу польскіх палітыкаў. Цяпер 460-мясцовы Сойм раскалоты на два варагуючыя лагеры. 194 крэслы належаць прадстаўнікам нацыяналістычна-кансерватыўнай былой кіруючай партыі «Права і справядлівасць», а парламенцкую большасць з 266 месцаў маюць дэпутаты аб'яднанай апазіцыі, якая сфарміравала новы ўрад Польшчы. Гэта адлюстраванне агульнай сітуацыі ў краіне, якую эксперты нярэдка называюць «халоднай грамадзянскай вайной». Што ж адбываецца ў краіне-суседцы?**




### Вайна кланаў

З кабінетаў і залаў паседжанняў палітычнае супрацьстаянне пашыраецца на вуліцах. Партыя «Права і справядлівасць» на мінулым тыдні аб'явіла антыўрадавы масавы пратэст у Варшаве, на якім сабраліся некалькі тысяч чалавек. «Прэзідэнт і канцылярыя — за «ПіС», Канстытуцыйны трыбунал, аналаг нашага Канстытуцыйнага Суда, — за «Права і справядлівасць», а сейм знаходзіцца ў руках кааліцыі 11 партый, — акрэсліў сітуацыю ў эфіры «Альфа Радыё» палітолаг Пётр Пятроўскі. — Канстытуцыйны трыбунал яшчэ да пачатку паседжання Сейма вынес рашэнне, што ўсе змены заканадаўства ў Польшчы — на карысць еўрабюракратыі. Я нагадаю, што еўрабюракраты ў момант праўлення краінай кабінета міністраў Маравецкага вынеслі цэлы спіс патрабаванняў, якія трэба ўкараніць у заканадаўства, змяніць законы Польшчы. І Канстытуцыйны трыбунал прызнаў гэтыя патрабаванні неканстытуцыйнымі. Такім чынам, Туск апынуўся ў такой сітуацыі, што ён не можа прыняць законы на падставе патрабаванняў Бруселя, і чаму? Нават калі ён іх прыме, Канстытуцыйны трыбунал іх заблакуе. І Туск вырашыў павысіць стаўкі і арыштаваць былых міністра і намесніка міністра ўнутраных спраў, якія, дарэчы, ужо былі прыцягнуты да адказнасці. І тут парадокс у тым, што Дуда іх памілаваў. Гэта значыць, фактычна Туск праз свае суды пачынае адмяняць памілаванне Дуды. Адбываецца канфлікт устаноў, інстытутаў».

Эксперт адзначыў, што Польшча цяпер знаходзіцца ў глыбокім палітычным крызісе, калі паміж двума кланамі — кланам лібералаў кампаніі Туска і кланам нацыянал-кансерватараў Качыньскага — адбываецца жорсткая барацьба і вайна:

— Але мы павінны тут разумець, што, умоўна кажучы, адны — шыла, другія — мыла. Сама сістэма польская не суверэнная. І не дарма што адны, што другія бегаюць да пасла Злучаных Штатаў Амерыкі Марка Бжэзінскага, які, дарэчы, даў добра на пасадку людзей, сказаў, што гэта, цытую, «аднаўленне канстытуцыйнасці і законнасці ў Польшчы». Тое, што Качыньскі аб'явіў вось гэтых двух — экс-міністра і яго намесніка — першымі палітвязнямі пасля 1989 года — гэта хлусня. Давайце згадаем хоць бы Матэвуша Піскорскага ці Анджэя Лепера, нават не палітвязня, можна яго назваць ахвярай палітычнага рэжыму Польшчы, які пры нявысветленых абставінах загінуў. І такіх прыкладаў вельмі шмат. Колькі людзей запалохвалі, атручвалі, колькі было спраў крымінальных і не толькі. Так што польскі рэжым і іх сённяшняя сістэма — вельмі жорсткія, — дадаў Пётр Пятроўскі.

### Маштабны крызіс

Польскія эксперты таксама адзначаюць глыбокі раскол грамадства, які пашыраецца. «У Польшчы разгараецца маштабны палітычны крызіс, які пагражае дэстабілізацыяй у краіне! Гэтаму садзейнічала палітыка ўладаў за апошнія 30 гадоў». Такім меркаваннем падзяліўся на тэлеканале «Беларусь 1» галоўны рэдактар польскага партала Strajk.eu Мачэй Вішнеўскі. Паводле яго слоў, польскае грамадства цяпер расколатае на дзве часткі і пакуль няма перадумоў да яго аб'яднання. «Сітуацыя, у якой мы сёння апынуліся, — мы да яе ішлі ў прынцыпе 30 гадоў пасля распаду ПНР з 1989 года, калі палітычныя эліты «салідарнасці», ліберальных дэмакратаў, кансерватараў, прыхільнікаў Захаду ўзялі Польшчу ў свае рукі. І гэта вынік таго, што тады эліты не справіліся з адказнасцю за дзяржаву. Крызіс будзе працягвацца з нейкімі спробамі яго вырашыць. Прычым я не вельмі веру ў поспех гэтых спробаў. А калі будуць нейкія бурныя выступленні і людзі паспрабуюць вырашаць свае праблемы праз пратэсты на вуліцы, то гэта можа мець вельмі сур'ёзныя вынікі. Адно зразумела, незалежна ад таго, што будзе, краіна застанецца падзеленай на дзве Польшчы».

У Варшаве рознагалоссі паміж партыямі на мяжы закона. Так лічыць польскі палітолаг і прадстаўнік таварыства «Польшча — Усход» Аляксандр Яцэк. «Гэтае супрацьстаянне існуе ў Польшчы доўгія гады. Праўда, за апошнія 8 гадоў перамога была за «ПіС», Качыньскі ў прынцыпе руліў Польшчай без звароту ўвагі на апазіцыю. Цяпер гэты парадак памяняўся. Сапраўды, «ПіС» вельмі цяжка пагадзіцца з тым, што яны страцілі ўладу. Але з іншага боку, яны прадугледзелі гэта. І за апошнія гады прынялі шмат законаў і арганізавалі шмат прадпрыемстваў, каб гэтую ўладу ўтрымліваць нават пасля пройгрышу ў выбарах. І вось цяпер, каб ім адабраць гэтую ўладу, каб забраць дзяржаўную медыйную прастору, даводзіцца Туску і новаму ўраду гуляць на мяжы права».

### Шляхам правакацый

Як адзначыў на YouTube-канале БелТА незалежны ваенны аналітык Аляксандр Алесін, супрацьстаянне Дуды і Туска можа мець цяжкія наступствы: «Улічваючы прыкладную роўнасць сімпатый сярод польскіх выбаршчыкаў да аднаго і другога блока, мы можам гаварыць аб сур'ёзных сутыкненнях на мяжы грамадзянскай вайны. Калі адсачыць усе дзеянні Туска, які прыйшоў да ўлады, то ён пачаў з прыватызацыі сродкаў масавай інфармацыі, якія раней знаходзіліся ў руках дзяржавы і папсавалі яму нямала крыві падчас перадвыбарнай кампаніі». На думку аналітыка, Дональд Туск будзе паступова канфіскоўваць з-пад кантролю ПіС сілавыя рычагі. «Мы бачым, што людзі, якія карыстаюцца пэўным аўтарытэтам у коле сілавікоў, паступова адбіраюцца з рэальнай палітыкі і пераводзяцца ў ранг зняволеных. Я думаю, гэты курс працягнецца і надалей. Але «Права і справядлівасць» глядзець на гэта абыякава не будзе і выкарыстоўвае рычагі, якія ў іх яшчэ засталіся. Гэта будзе вельмі жорсткае супраціўленне», — лічыць Аляксандр Алесін.

Пры гэтым напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў Дуда можа паспрабаваць дасягнуць поспеху ў польскіх выбаршчыкаў шляхам правакацый, лічыць ваенны аналітык. «У Польшчы ўжо хутка стартуе кампанія па выбарах прэзідэнта. А ўлічваючы маленькую перавагу, якая ёсць у апазіцыі над «Правам і справядлівасцю», шалі могуць нахіліцца ў любы бок. Як мне ўяўляецца, Дудзе неабходны поспехі. Наўрад ці ў самой Польшчы ён можа зрабіць нейкія вырашальныя дасягненні. Асабліва на фоне праблем з эканомікай і абвастрэння адносін з Украінай. У Польшчы для яго склалася тупіковая сітуацыя», — адзначыў Аляксандр Алесін. Такім чынам, лічыць аналітык, Анджэй Дуда будзе спрабаваць дасягнуць нейкіх мэт на знешнепалітычнай арэне. «Я думаю, ён паспрабуе дэстабілізаваць сітуацыю ў нашай краіне. Улічваючы надыходзячую ў Беларусі электаральную кампанію, усе тыя, хто затаіўся на нашай тэрыторыі, могуць актывізавацца. Адначасова з гэтым пачнецца падсілкоўванне гэтых сіл з-за мяжы», — мяркуе ён. На думку Аляксандра Алесіна, Польшча можа распачаць новыя недружалюбныя дзеянні ў дачыненні да беларускіх перавозчыкаў і рэшткаў беларускага экспарту ў Еўропу.

### Разрыў пашыраецца

Польшча апынулася ў стане палітычнага, эканамічнага і ідэалагічнага крызісаў. Такое меркаванне ў эфіры «Альфа Радыё» абгрунтаваў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, старшыня праўлення Беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін. Ліквідацыю польскіх вядучых дзяржаўных СМІ эксперт расцаніў як самавыкрыццё заходняй дэмакратыі: «Гэта такі працэс, які дэманструе, што ніякай дэмакратыі на Захадзе няма. Прыхільнікі новага польскага прэм'ер-міністра Дональда Туска шчыра кажуць, што яны проста зводзяць рахункі. У апошнія месяцы прапагандысцкая машына Польшчы адпрацоўвала павестку ў інтарэсах кіруючай клікі Дуды, Качыньскага і Маравецкага, палівала брудам апанентаў кіруючай партыі «Права і справядлівасць».

Парламенцкія выбары ў Польшчы не толькі не завяршылі палітычны крызіс, яны яго пагоршылі, адзначыў Вадзім Гігін: «Польшча перажывае глыбокі зацяжны крызіс. Сур'ёзныя эканамічныя праблемы ў краіне звязаны з інфляцыяй, беспрацоўем, нераўнамерным развіццём рэгіёнаў. Разрыў у ідэалогіі паміж старэйшым пакаленнем палякаў і маладым, паміж Варшавай і астатняй Польшчай, паміж буйнымі і малымі гарадамі, паміж усходняй і заходняй Польшчай — проста каласальны, ён пашыраецца на вачах».

Па меркаванні Вадзіма Гігіна, усе польскія палітыкі так ці інакш карумпаваныя і злоўжывалі службовым становішчам. «Мы павінны разумець спецыфіку польскай палітыкі і тых скандалаў, у якія яна аказалася ўцягнутая і загразла. То бок польскі палітык, прыходзячы да ўлады, робіць усё для нанясення максімальнай шкоды сваім апанентам, выкарыстоўваючы гэтую ўладу. Гэта рабіла «Права і справядлівасць», гэта робіць зараз урад Туска, — заўважыў эксперт. — Хоць, здавалася б, яны ішлі як лібералы, як урад грамадзянскага свету, яны пра гэта заяўлялі, заяўлялі пра гэта і малодшыя партнёры, «Лявіца» і «Трэці шлях», што яны не будуць зводзіць рахункі. Што адбылося? Поўны разгром польскіх дзяржаўных СМІ, бо яны цкавалі Туска. Цяпер ключавыя фігуры ўрада і адміністрацыі Маравецкага, Качыньскага зачышчаюцца, я думаю, што дойдуць і да самога Качыньскага. Аб гэтым адкрыта пішуць. Ён ім пакуль не па зубах, але будуць расследаванні. Колькі будзе Туск ва ўладзе, столькі ён будзе цкаваць Качыньскага. Так, гэта ворагі нашы ў любым выпадку, і тыя, і іншыя, але разам з тым той жа Качыньскі — ідэалагічны апанент вось гэтай неліберальнай, заходнееўрапейскай і трансатлантычнай зграі. Ёсць спецыфіка такога шавіністычнага менталітэту польскіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, мы гэта разумеем усё».

Як адзначыў эксперт, менавіта таму Беларусь выбудоўвае доўгатэрміновую лінію на абарону нашых нацыянальных інтарэсаў ад польскага ўплыву: «Мы павінны разумець, палякі — гэта моцны еўрапейскі і славянскі народ, які жыве з намі побач, але заўсёды, калі польскі ўплыў узмацняўся ў Беларусі, гэта абарочвалася катастрофай для нашага народа. Мы мусім гэта разумець. У гэтым таксічнасць так званага польскага лідарства, якое да канца ніколі не рэалізоўвалася. Польскай палітычнай эліце няма чаго прапанаваць рэгіёну».

Якія б людзі ні былі ў польскай уладзе, мы заўсёды выступаем за дружалюбны і добрасуседскі дыялог, падкрэсліў Вадзім Гігін. «Але мы заўсёды гаворым і памятаем гэтую фразу: «Памятай, ляша: па Буг — усё наша!» Вось гэта дакладны пасыл, які мы даём, а далей давайце сябраваць, гандляваць. Нам усё роўна, хто ва ўладзе — Туск, Качыньскі. Вы да нас не лезьце, а ў сябе рабіце тое, што хочаце. Мы ў гэтым не паўдзельнічаем, мы проста канстатуем, — падкрэсліў эксперт. — Вось з гэтымі сваімі разборкамі сядзіце ў сябе і там разбірайцеся. Качыньскі, Туск, Сікорскі, да нас не лезьце. Будзеце лезці — атрымаеце па зубах вы і ваша агентура».

### Тратыл у тры змены

Тым часам стала вядома, што абаронная галіна Польшчы перажывае зараз перыяд істотнага росту. Аб гэтым са спасылкай на даныя Rzeczpospolita паведаміла РІА «Новости». Напрыклад, кампанія Nitro-Chem, размешчаная ў Быдгашчы, значна павялічыла вытворчасць. Кіраўнік кампаніі Дамінік Савіцкі заявіў, што вытворчасць тратылу вядзецца кругласутачна. Завод Lucznik у Радаме праз два гады плануе вырабляць 100 тысяч аўтаматаў у год і цяпер набывае новую тэхніку. Аналагічнае становішча склалася і на іншых прадпрыемствах. Huta Stalowa Wola, адзін з самых буйных ваенных заводаў у Польшчы, вырабляе артылерыю, самаходныя гаўбіцы і іншыя цяжкія ўзбраенні, а ў хуткім часе стане пастаўшчыком БТР і БМП. Кіраўнік кампаніі Ян Шведа заявіў, што ім далі два гады на падваенне вытворчасці. На думку Rzeczpospolita, гэты інвестыцыйны бум у польскую абаронную галіну абумоўлены высокім рынкавым попытам, выкліканым канфліктам ва Украіне.

Польшча з'яўляецца самым важным саюзнікам ЗША на ўсходнім флангу НАТА, заявіў намеснік кіраўніка МЗС Польшчы Анджэй Шэйна ў інтэрв'ю выданню Rzeczpospolita. Ён назваў дзеючага прэзідэнта ЗША Джо Байдэна падарункам нябёсаў для Польшчы. Шэйна таксама заявіў, што краіна гатова размясціць нямецкія войскі на сваёй тэрыторыі. «Калі немцы захочуць узмацніць усходні фланг НАТА ў Польшчы, як яны гэта зрабілі ў Літве, то сардэчна запрашаем», — сказаў дыпламат. Ён таксама падкрэсліў, што «ва ўмовах баявых дзеянняў за ўсходняй мяжой Польшчы» Варшава вітае любое супрацоўніцтва з боку саюзнікаў. Адзначаецца, што на дадзены момант на тэрыторыі краіны раскватараваны каля 10 тысяч амерыканскіх салдат. Акрамя таго, Анджэй Шэйна заклікаў палякаў быць гатовымі да новай хвалі бежанцаў з Украіны. Заява аб з'яўленні нямецкага ваеннага кантынгенту ў Польшчы выкліча новы віток «халоднай» грамадзянскай вайны ў краіне, мяркуе палітычны эксперт Аляксандр Насовіч, паведаміў sputnik.by.

А пра простых палякаў польскія ўлады проста «забыліся». Як стала вядома, у краіне павялічваецца колькасць бяздомных. Прычым гэтая з'ява пашыраецца сярод моладзі. Паводле інфармацыі выдання Polityka, каля 800 чалавек ва ўзросце 18-25 гадоў перажываюць крызіс бяздомнасці. Аднак няўрадавыя арганізацыі лічаць, лічба моцна заніжаная, паколькі чыноўнікі атрымліваюць даныя ў асноўным з часовых прытулкаў — з месцаў, куды моладзь практычна не трапляе. Калі яшчэ 10 гадоў таму ў краіне маладымі бяздомнымі станавіліся былыя выхаванцы дзіцячых дамоў або папраўчых устаноў, то зараз адзначаецца рост колькасці такіх людзей з паўнацэнных сем'яў. У гэтай сітуацыі дакладна відаць прыярытэты афіцыйнай Варшавы. І яны дакладна не на карысць людзей.

**Пётр ДУНЬКО.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Як вырасціць мікразяленіва

**Адносна новы павеў нашага жыцця — мікразяленіва. Гэта цудоўны прадукт, які зараджае арганізм карыснымі рэчывамі, асабліва дэфіцыт якіх адчуваецца ў перыяд зімовых кароткіх пахмурных дзён і сакавіцкага авітамінозу. У супермаркетах і гандлёвых цэнтрах з'явіліся паліцы пышных латочкаў з далікатным зяленівам. Аднак кошты кусаюцца... Добрая навіна заключаецца ў тым, што мікразяленіва можна вырошчваць самастойна. Давайце разбірацца, як гэта можна зрабіць.**



## Якое браць насенне

Тут няма ніякіх абмежаванняў, усё залежыць толькі ад вашага густу. Выключэнне — фасоля: яе парасткі ўтрымліваюць таксічныя рэчывы, якімі можна атруціцца. Многія выбіраюць хуткарослыя культуры. Адны валодаюць далікатнымі тонкімі парасткамі (рукала, салаты, радыска), а іншыя, такія як гарох і сланечнік, цешаць моцненькай зелянінай. Часам культура, якую вы і не падумалі б вырасціць у сваім звычайным агародзе, завеўвае сэрца ў выглядзе мікразяленіва. Таму трэба спрабаваць і адкрываць для сябе новыя смакі.

## У глебе ці іншым субстраце

Гэта самы папулярны спосаб вырошчвання. Неабходна шырокая ёмістасць. Дрэнажныя адтуліны ў ёй рабіць патрэбы няма. Замочваем насенне, тэрмін залежыць ад культуры. Напрыклад, для крэс-салаты дастаткова 15—20 хвілін. Гарох замочваюць на 12—18 гадзін. Мангольд, сланечнік, бурак — на 8—12 гадзін. Насыпаем трохі вільготнай садовай зямлі ці грунту для расады (той грунт, што прадаецца для хатняга кветкаводства, лепш не браць), досыць пласта таўшчынёй тры-чатыры см. Густа раскладваем насенне, багата змочваем яго з пульверызатара, трохі прысыпаем зямлёй і накрываем ёмістасць з пасевамі празрыстай хованкай — гэта можа быць шкло, пластыкавае вечка, харчовая плеўка, пакет, слоік.

Выстаўляем кантэйнеры на светлы падваконнік. Пасля з`яўлення парасткаў хованку можна зняць. Догляд заключаецца ў апырскванні зяленіва два-тры разы на дзень. Далей наступаем адпаведна культуры, якая гадуецца: даем адрасці толькі семядольным лісткам і зразаем іх, альбо чакаем з'яўлення аднаго-двух сапраўдных лісцікаў і ўжываем у ежу. Гатовае мікразяленіва можа захоўвацца ў халадзільніку 6-7 дзён. Трэба заўважыць, што ў якасці глебы для пасеву насення можа выступаць і іншы матэрыял, падобны да прапанаванага вышэй, — вермікуліт, перліт, какосавы субстрат і т. п.

## На паперы

Тэрмін вырошчвання мікразяленіва нядоўгі, усе пажыўныя рэчывы мініяцюрная расліна атрымлівае з запасаў семачка. Таму асновай могуць стаць мяккая гіграскапічная папера (напрыклад, туалетная) або папяровыя кухонныя ручнікі. Існуюць і іншыя варыянты:

*Варыянт 1*

Бярэм неглыбокі латок, кладзем на дно паперу, багата змочваем. Раскладваем падрыхтаванае насенне, робім празрыстую хованку і выстаўляем на падваконнік. Нельга налiваць занадта шмат вады: насенне не павінна плаваць у ёй. Пасля з'яўлення ўсходаў хованку прыбіраем і падтрымліваем паперу заўсёды вільготнай. Для гэтага два-тры разы на дзень неабходна апырскваць сеянцы.

*Варыянт 2*

Бярэм туалетную паперу, дадаткова да яе наразаем палоскі поліэтылену такой жа шырыні. Кладзём поліэтылен, зверху — паласу туалетнай паперы. Добра змочваем з ручнога апырсквальніка. Па краі, крыху адступіўшы, раскладваем насенне. Затым акуратна скручваем у рулончык папяровую аснову разам з плеўкай, ставім у слоік ці шклянку і наліваем трохі вады. На ёмістасць надзяваем пакет або накрываем яе празрыстай пластыкавай шклянкай. У такіх рулончыках мікразяленіва выдатна расце, і нават паліў-апырскванне не патрэбныя. Галоўнае — сачыць, каб у ёмістасці заўсёды была вада.

А яшчэ ў якасці асновы для пасеву насення можна ўзяць вату ці ватныя дыскі. Падыдуць таксама марля, нятканыя сурвэткі і г. д.

## У слоіку

Выгадаваць порцыю мікразяленіва можна ў звычайным слоіку. Для гэтага трэба ўзяць чыстую ёмістасць, насыпаць у яе насенне і заліць вадой на суткі для набухання.

Далей бярэм кавалак марлі ці іншага падыходзячага сеткаватага матэрыялу, зацягваем рыльца слоіка і замацоўваем гумкай ці чымсьці падобным. Пасля набухання насення зліваем ваду і прамываем насенне, не здымаючы сеткі. Затым пераварочваем слоік уверх дном і ўсталёўваем на паддон пад вуглом каля 30 градусаў, каб сцякала вада. Догляд заключаецца ў прамыванні насення, якое прарастае, і парасткаў чыстай вадой два-тры разы на дзень. У стане спакою слоік павінен быць заўсёды ў зыходным становішчы — уверх дном і пад нахілам.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.17 | 17.23 | 8.06 |
| Віцебск — | 9.13 | 17.06 | 7.53 |
| Магілёў — | 9.07 | 17.13 | 8.06 |
| Гомель — | 8.57 | 17.17 | 8.20 |
| Гродна — | 9.31 | 17.39 | 8.08 |
| Брэст — | 9.25 | 17.47 | 8.22 |

## Месяц

*Першая квадра ў 6.52.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

**Пр.** *Іосіфа, Рыгора, Яўгеніі.*
**К.** *Пятра, Хрысціны.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 18 СТУДЗЕНЯ

У краіне

**1664** год — са з'яўленнем у Мінску мноства юрыдык (адміністрацыйна і юрыдычна адасобленых частак горада) граматай караля прадпісана ў цяперашняй сталіцы і іншых гарадах жыхарам з ліку рамеснікаў абавязкова ўваходзіць у склад цэхаў.

**1879** год — нарадзіўся (в. Каменная, цяпер у Брэсцкім раёне) Антон Іванавіч Лапацін, генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза. У арміі з 1916 года, у Чырвонай Арміі — з 1918-га. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года: камандуючы арміямі на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Паўночна-Заходнім, Калінінскім, І Прыбалтыйскім, ІІІ Беларускім франтах. Войскі пад яго камандаваннем удзельнічалі ў вызваленні Беларусі, Прыбалтыкі, правядзенні Усходне-Прускай аперацыі. Падчас Беларускай аперацыі (1944) намеснік камандуючага 43-й арміяй, удзельнічаў у акружэнні віцебскай групоўкі ворага і вызваленні Віцебска. Вызначыўся пры ўзяцці Кёнігсберга (Калінінград). Удзельнік вайны з Японіяй на Далёкім Усходзе.

**1882** год — нарадзіўся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў і архітэктуры Беларусі, доктар архітэктуры, прафесар. Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі. Сярод работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў «Эскіза планіроўкі Мінска» і схемы генплана пасляваеннага Гомеля.



**1904** год — нарадзіўся Барыс Андрэевіч Бабачкін, савецкі акцёр, рэжысёр, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, прафесар. У маладыя гады акцёр працаваў у тэатры Магілёва, здымаўся ў беларускіх фільмах «Першы ўзвод», «Двойчы народжаны» і іншых стужках. Асаблівую вядомасць набыў, выканаўшы ролю В. І. Чапаева ў аднайменным фільме братоў Васільевых. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

У свеце

**1689** год — нарадзіўся Шарль Луі Мантэск'ё, французскі асветнік і правазнавец эпохі Асветы, адзін з пачынальнікаў ідэалогіі лібералізму. Распрацаваў дактрыну аб падзеле ўлад. Менш вядомы як аўтар празаічных пастараляў і салоннай літаратуры ў стылі ракако.



**1778** год — англійскі мараплавец Джэймс Кук адкрыў Гавайскія астравы і назваў іх Сандвічавы астравы.

**1919** год — пачалася Парыжская мірная канферэнцыя, скліканая дзяржавамі-пераможцамі ў Першай сусветнай вайне для выпрацоўкі мірных дагавораў з пераможанымі краінамі. Канферэнцыя адобрыла Статут Лігі Нацый.

Так гаварыў...

**БЕНДЖАМІН ФРАНКЛІН:**

*«Калі ты купляеш тое, што табе не трэба, то хутка будзеш прадаваць тое, што табе неабходна».*

## УСМІХНЕМСЯ

**У сучасным мастацтве разабрацца лёгка: што вісіць на сцяне — жывапіс, што можна ўбачыць ззаду — скульптура.**

Міжсезонне ў траўматолагаў — гэта калі сноўбардысты ўжо скончыліся, а мотацыклісты яшчэ не пачаліся.

**Калі вам падчас вячэры раптам стала сумна, пасярод размовы на адцягненыя тэмы паглядзіце мужу прама ў вочы і спытайце: «А хто такая Лена?»**

У індустрыі забаў самай удалай ідэяй было падзяліць людзей на два полы.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.292. Індэкс 63850. Зак. № 27.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12